Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 295 (5969) | 23 снежня 1937 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Всесоюзная библиотека

Стаханаўцы Менска заклікаюць рабочых, інжынераў, тэхнікаў і служачых прадпрыемстваў БССР падтрымаць прапанову стаханаўцаў Масквы і Маскоўскай вобласці—замацаваць поспехі сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў, узорна падрыхтавацца да 1938 года і правесці ў студзені сталінскі месячнік стаханаўскіх рэкордаў.

З усіх куткоў Совецкай Беларусі прыходзяць весткі аб аднадушным адабрэнні ініцыятывы стаханаўцаў Масквы і Маскоўскай вобласці, аб новых вытворчых поспехах, з якімі сустракае краіна новы, 1938 год—першы год трэцяй сталінскай пяцігодкі.

ПРЫЁМ НОВЫХ ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ

У барацьбе за соцыялізм, за гады сталінскіх пяцігодак партыя выхавала шматлікі слой непартыйных большэвікоў, правераных па самаадданай рабоце і бясконца адданых справе партыі Леніна—Сталіна. Будучы моцна звязана з масамі, большэвіцкая партыя стварыла закал сябе велізарную армію беспартыйных большэвікоў, з кожным днём усё больш усвойваючых ад партыі яе дысцыпліну, яе прынцыповасць і ўпартасць у ажыццяўленні соцыялізма.

Выбары ў Вярхоўны Совет яшчэ раз пераканаўча і ярка паказалі высокі патрыятызм народных мас совецкай краіны, бязмежную любоў беспартыйных да партыі Леніна—Сталіна, велізарнае яднанне партыі з беспартыйнымі масамі. Выбарчы блок комуністаў і беспартыйных — гэта адзін з вынікаў моцнай, непарушнай сувязі большэвікоў з масамі. У часе выбарчай кампаніі падняўся новы, велізарны слой беспартыйных актывістаў, якія разам з комуністамі горача агітавалі за большэвіцкую партыю і падтрымліваемых ёю кандыдатаў. Каля 10 тысяч беспартыйных агітатараў правялі ў раёнах Масквы вялікую, надзвычай плённую работу сярод насельніцтва. Мы прыводзім сёння выступленні таварышоў з Пролетарскага раёна, прадстаўляючых гэты дзесяцітысячны атрад. У кожнага з іх — адно жаданне, адна думка: і далей дапамагаць партыі ў яе велізарнай творчай рабоце, у яе барацьбе за соцыялізм.

Многія з беспартыйных актывістаў выбарчай кампаніі падаюць заявы аб прыёме ў партыю. Вось што піша ў сваёй заяве дзён з армії беспартыйнага актыва—тав. Агнатаў, які прапрацаваў 32 гады на чыгунцы імя Варашылава:

«Хоць я і пажылы чалавек, але адчуваю сябе маладым. Прашу прыняць мяне ў рады нашай вялікай партыі Леніна—Сталіна. У мяне няма другога шляху ў жыцці, як актыўна ісці ў ногу з партыяй. Я да канца аддам свой вопыт і веды, а калі патрэбуецца — жыццё партыі і народу».

Жалезнай сцяной акружае зараз партыю велізарны беспартыйны актыў, які з'яўляецца рэзервам для папаўнення партыйных радоў. Небывалы палітычны ўздым, грамадская актыўнасць праяўныя у сувязі з выбарамі ў Вярхоўны Совет СССР, новыя тысячы і тысячы беспартыйных агітатараў, выяўленыя выбарчай кампаніяй, — усё гэта яшчэ больш расшырае магчымасці партыйных арганізацый у справе індывідуальнага адбору ў партыю лепшых, перадавых людзей нашай краіны, беззаветна адданых справе соцыялізма.

Год прайшоў, як Цэнтральны Камітэт аднавіў прыём у партыю. Цэнтральны Камітэт патрабаваў у сваёй пастанове, каб прыём у партыю праводзілі ў строга індывідуальным парадку. Гэты ленінска-сталінскі прынцып папаўнення партыйных радоў — непахісны закон росту партыі.

Строга індывідуальны адбор дапамог партыі за гэты год папоўніць свае рады тысячамі перадавых рабочых, калгаснікаў, лепшых людзей совецкай інтэлігенцыі. На асобных прадпрыемствах Масквы, Ленінграда пярвічныя партарганізацыі ўключылі ў свае рады значную колькасць новых комуністаў з ліку лепшых стаханаўцаў, вядомых краіне людзей. Усяго з пачатку аднаўлення прыёму ў партыю прынята, па папярэдніх даных, у кандыдаты 46.289 чалавек і ў члены ВКП(б) — 51.675. Райкомы і гаркомы зацвердзілі з гэтага ліку ў кандыдаты — 27.785 чалавек і ў члены партыі — 33.720.

Пільнасць, строгая індывідуальная праверка пры прыёме ў партыю, агароджанне яе радоў ад ворагаў, чужакоў, людзей гнілых — вось асноўнае патрабаванне, якое пра'яўляецца кожнай партыйнай арганізацыі. Але гэтыя прынцыпы многія партыйныя кіраўнікі памылкова поўным ажаўленнем ад папаўнення радоў партыі. Фактычна ў многіх арганізацыях да гэтага часу закрыт прыём у партыю. Так, відаць, спакайней, так менш клапатліва!

Ёсць партыйныя кіраўнікі, якія зусім беспадстаўна тармозяць ўступленне ў партыю перавоз з кандыдатаў у члены ВКП(б) палітычна чэсных людзей, зыслатных работнікаў вытворчасці, актыўных у грамадскім жыцці. У Калініне на вагонным заводзе працуе слесар Ларушкін. Ён, сын калгасніка, прышоў у 1931 годзе на завод з Чырвонай Арміі. Палітычна вырас і загартаваўся ў сваім цэху. Стаў добрым работнікам вытворчасці. Комуністы цэха і сакратар парткома тав. Грыгор'еў даюць аб ім добрыя водгукі. І ўсё-ж ніхто не жадае даць яму рэкамендацыю для ўступлення ў партыю. Ёсць нямала фактаў штучнага недавер'я з боку партыйных арганізацый да беспартыйных актывістаў, якія імкнуцца ў комуністычную партыю.

У Растове-на-Дану Чыгуначны і Сталінскі райкомы на працягу дзесяці месяцаў не прынялі ў партыю ні аднаго чалавека! А ў гэтых-жа раёнах нямала ёсць рабочых, якія імкнуцца ў нашу партыю і дастойныя быць у яе радах!

Як правіла, раённыя пярвічныя партыйныя арганізацыі не зятуць актыўнай работы па прыёму ў партыю перадавых людзей і абмяжоўваюцца толькі разглядам заяў. Але нават гэты аўтаматычны разгляд заяў зацягваецца месяцамі. Пяганіна, бюракратызм, — вось, на жаль, з чым сутыкаюцца ў некаторых арганізацыях чэсныя людзі, якія горача імкнуцца стаць комуністамі. Прывядзем такі факт. У Дзержынскім раёне, Горкаўскай вобласці, заява спачуваючага Марозава ляжыць у партыйнай арганізацыі з 15 студзеня 1937 года нерагледжанай.

Сур'ёзнае пытанне — рэкамендацыя. Законна тут настарожанасць пільнасць. Нельга выдаваць рэкамендацыю чалавеку, якога не праверыў, якога не ведаеш. Але як далёка ад большэвізма труслівая перастрахоўка, безадказная баязнь рэкамендаваць чалавека, які варты быць у радах партыі!

Вялікі рэзерв для росту партыі — спачуваючыя, комсамол. Адна з задач — гэта клапатлівае выпрабаванне з гэтага рэзерву новых членаў партыі. Партыя — жывы арганізм. Яна аслабаняецца ад людзей, выпадкова пранікшых у яе рады, людзей чужых, варожых. І адначасова папаўняецца, расце за лік лепшых, перадавых людзей, з рабочага класа ў першую чаргу. У комсамоле ёсць актывісты, якія выраслі ўжо ў самастойных кіраўнікоў, якім чамусьці закрываюць доступ у партыю і тым самым тармозяць рост, вылучэнне новых кадраў. Многія партыйныя і комсамольскія арганізацыі паклалі пад сукно рашэнне ПК ВКП(б) аб упятнаццаці комсамольцаў у партыю.

Прыём у партыю зараз вельмі адказны ўчастак партыйнай работы. Патрэбна вострая пільнасць, каб не прапусціць у большэвіцкія рады ворага, шпіёна, дыверсанта. Вядома, што агенты замежных разведак усялякімі шляхамі прабуюць пранікнуць у рады партыі, каб замаскаваўшыся, весці ў нас у краіне разбуральную работу. Трэба старанна правяраць кожнага ідучага ў партыю. Правяраць палітычны твар, авангардную роль на вытворчасці, акружэнне і, што вельмі важна, маральны воблік чалавека.

Строга правяраючы кожнага поваўступаючага, трэба адмовіцца ад аўтаматызма ў прыёме ў партыю. Задача партыйных арганізацый — бліжэй падысці да беспартыйных мас, да таго новага атрада агітатараў, які падняўся за час гістарычнай выбарчай кампаніі ў нашай краіне, уважліва прыглядацца да людзей, якія імкнуцца ў нашы рады, і ўмелым выхаваннем адбіраць у партыю людзей, самааддана паказаўшых сябе ў барацьбе за соцыялізм.

«Не трэба забываць, што партыйныя не падаюць з неба. Трэба памятаць, што ўсе партыйныя самі былі калісьці беспартыйнымі. Сёння ён беспартыйны, а заўтра стане партыйным». (Сталін).

Новыя велізарныя рэзервы актыўных барацьбітоў за соцыялізм выраслі вакол партыі. Гэтыя рэзервы растуць з кожным днём, растуць разам з перамогамі соцыялізма, разам з палітычным і вытворчым уздымам у нашай краіне. Строга захоўваючы прынцып індывідуальнага падбору, старанна правяраючы людзей, трэба даць дарогу ў большэвіцкія рады выдатнаму, да канца адданаму партыі Леніна—Сталіна беспартыйнаму актыву.

«ПРАВДА».

НАПЯРЭДАДНІ СЛАЎНАГА ДВАЦЦАЦІГОДДЗЯ УССР

КІЕЎ. (Па тэлефону ад спец. кар. «Звязды»). 24 снежня спаўняецца 20 год існавання совецкай улады на Украіне. Вызваленыя ад нацыянальнага ўціску, народы УССР пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў і вялікага Сталіна за 20 год існавання совецкай улады стварылі сваю першакласную социялістычную індустрыю, буйную калектывізаваную сельскую гаспадарку, заваявалі вышыні культуры і навукі.

Разам з усімі народамі вялікага Совецкага Саюза ўкраінскі народ жыве заможным, шчаслівым, культурным жыццём. Украінскі народ святкуе сваю перамогу ў саюзе з вялікім рускім народам, пры брацкай дапамозе якога ён заваяваў сваю незалежнасць. Разам з усімі народамі СССР, ён святкуе перамогу ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Да вялікага свята рыхтуецца ўся Украінская рэспубліка. Стаханаўцы прамысловасці адзначаюць падрыхтоўку да свята новымі рэкордамі, стаханаўцы сельскай гаспадаркі — вялікім прадпнём, работнікі навукі і культуры — новымі перамогамі на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

З незвычайнай урачыстасцю сустракае свята сталіца Совецкай Украіны. Вуліцы Кіева прынялі святочны выгляд. Усюды — велізарныя партрэты правадыроў народа Леніна і Сталіна, партрэты членаў Палітбюро ЦК ВКП(б), кіраўнікоў Чырвонай Арміі. На будынках вялікія панно індустрыяльных пабудоў з партрэтамі герояў працы, імёны якіх вядомы ўсёй краіне — Алексея Стаханава, Петра Крываноса, Макара Мазая і інш. Усё апрацута ў чырвань плакатаў і лозунгаў. Вецер горда развявае мора сцягоў.

23 снежня адбудзецца ўрачыстае пасяджэнне пленума Кіеўскага горсавета з удзелам партыйных, совецкіх, профсаюзных, комсамольскіх арганізацый, прысвечанае 20-годдзю. На заводах, фабрыках, ва ўстановах, у часцях Чырвонай Арміі адбудуцца ўрачыстыя сходы, на якіх выступяць з успамінамі ўдзельнікі барацьбы за Совецкую Украіну.

24 снежня днём на плошчах і вуліцах адбудзецца вялікае народнае гуляння. Вечарам у клубах і на прадпрыемствах выступяць работнікі мастацтва і літаратуры, калектывы мастацкай самадзейнасці на прадпрыемствах і ва ўстановах. Ва ўсіх тэатрах будуць паказаны лепшыя пастаноўкі. У лепшых кінатэатрах дэманструецца выдатны гісторыка-рэволюцыйны фільм «Ленін у Кастрычніку».

С. ГАЛКІН.
П. КАВАЛЁЎ.

УЗОРНА ПАДРЫХТУЕМСЯ ДА СТАЛІНСКАГА МЕСЯЦА СТАХАНАЎСКІХ РЭКОРДАЎ

АДКАЗ СПРАВАЙ

У адказ на зваротам стаханаўцаў Масквы і стаханаўцаў Менска аб арганізацыі дастойнай сустрэчы 1938 года і правядзенні сталінскага месячніка стаханаўскіх рэкордаў, перадавыя рабочыя і работніцы менскага завода ланцугоў Галя Ўстанаўліваюць новыя вытворчыя рэкорды.

З 21 снежня па 1 студзеня на прадпрыемстве пераводзіцца стаханаўскі дэкадзнік. У першы і другі дзень дэкады штампоўшчык слясарна-зборачнага цэха тав. Кронік дабіўся рэкорднай выпрацоўкі — 510 проц. нормы. Слесар тав. Каўрыгін 21 снежня даў 475 проц. нормы, а 22 снежня — 480 проц. Слесар тав. Талейка 22 снежня даў 439 проц. нормы, электразварышчык тав. Гулько — 410 проц., валачыльшчык тав. Зіневіч — 314 проц., слесар тав. Крывашэеў—300 проц.

У штамповачным цэху новы рэкорд устанавіў штампоўшчык тав. Масюкевіч. 21 снежня ён выканаў норму на 400 проц., а 22 снежня — на 410 проц. Работніца тав. Нечай выканала дзве нормы.

Сярэдняе выкананне норм за першую змену 22 снежня па тэрмічнаму цэху склала 202 проц., па слясарна-зборачнаму цэху — 192,4 проц., па штамповачнаму цэху — 183 проц.

Замацоўваюць поспехі сталінскай дэкады

У мэблевай арцелі «Дрэваапрацоўшчык» (Менск) ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка да сталінскага месячніка стаханаўскіх рэкордаў. Ва ўсіх цэхах адбываюцца нарады па пытанню гатоўнасці арцелі да месячніка.

Арцель налічвае 76 проц. стаханаўцаў і 10 проц. ударнікаў да агульнай колькасці ўсіх рабочых. За стаханаўскую дэкаду лік стаханаўцаў павялічыўся на 15 чалавек.

Стаханавец арцелі т. Сэвіцкі за час дэкады ў сярэднім выконваў сваю зменную норму на 445 проц.; т. Чамаданаў — на 417 проц.; т. Зубкоўскі — на 395,5 проц.; т. Саўчык — на 306 проц. Гэтыя паказальнікі яны замацоўваюць. 21 снежня стаханавец т. Чамаданаў выканаў сваю зменную норму на 412 проц., т. Саўчык — на 275 проц.

Перадавыя брыгады па рамонту трактароў

У адказ на зварот маскоўскіх стаханаўцаў, сярод трактарыстаў Менскага раёна разгортваецца стаханаўскі рух.

У соўгасе «Горкі-Абчак» трактарная брыгада тав. Шыкуловіча датэрмінова завяршае бягучы і капітальны рамонт трактароў. Токар Дзержынскай МТС тав. Васюкевіч, працуючы на рамонце трактароў, сістэматычна выконвае норму на 175 проц. Рамонтная брыгада трактарыста Вазая Владзіміра па рамонту і мантажу трактарных сеялак штодзённа выконвае норму на 150 проц.

С. Г.

ГОРАЧА ВІТАЮЦЬ ЗВАРОТ СТАХАНАЎЦАЎ МАСКВЫ І МЕНСКА

Па ўсіх прадпрыемствах БССР адбываюцца сходы рабочых, прысвечаныя зваротам стаханаўцаў Масквы і Маскоўскай вобласці, а таксама стаханаўцаў Менска.

Жывы водгук знайшоў зварот на прадпрыемствах Гомеля. На сходзе рабочых дрэваапрацоўчага камбіната імя Ежова прысутнічала 1.100 чалавек. Выступіўшыя стаханаўцы тт. Варанцоў, Камароў, Гладкоў і іншыя заявілі аб сваёй гатоўнасці ўключыцца ў сталінскі месячнік стаханаўскіх рэкордаў і разгортваць сацыялістычнае спаборніцтва між сабой.

— У гонар 20 гадавіны ВЧК—АДПУ—НКВД, — сказаў тав. Гладкоў, — нашаму камбінату прысвоена імя сталінскага наркома тав. Ежова. Мы з гонарам апраўдаем гэта высокае імя.

На лепшае правядзенне сталінскага месячніка рабочыя камбіната імя Ежова выклікалі на соцспаборніцтва рабочых Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната і шклозавода імя Сталіна.

***

Прапаноза маскоўскіх стаханаўцаў знайшла гарачае палтрымане і ў рабочых гор. Бабруйска.

Стаханаўцы машынабудаўнічага завода імя Сталіна дабіваюцца новых перамог. Слесары тт. Мац і Златкін 19 снежня пры вырабу ламатак для гідратурбін выканалі сваю норму кожны на 460 проц. Слесар тав. Грахоўскі ў гэты дзень выканаў сваю норму на 433 проц. Завод за дзень выканаў план на 103 проц.

Стаханаўны фабрыкі «Чырвоны харчавік» абавязаліся да 1 студзеня даць звыш гадавога плана прадукцыі на 2.300 тыс. руб.

***

21 снежня адбыўся сход рабочых аўтаматнага цэха рэчыцкай запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік». Выступіўшы на сходзе стаханавец тав. Кіржаноўскі заклікаў усіх рабочых цэха адказаць на зварот стаханаўцаў Масквы і Маскоўскай вобласці новым уздымам прадукцыйнасці працы. Тав. Кіржаноўскі абавязаўся давесці выпрацоўку на зарадзе аўтаматаў да 225 скрыняў запалак пры норме 200 і знізіць брак да мінімума.

Рабочыя цэха аднадушна пастанавілі зрабіць студзень сталінскім месяцам стаханаўскіх рэкордаў.

21 снежня стаханаўка зборачнага цэха фабрыкі тав. Гутнікава, працуючы на набіўцы запалак, выпрацавала за змену 85 скрыняў запалак пры норме 61 скрыня.

Абавязацельства стаханаўца тав. Бірукова

ВІЦЕБСК. Ва ўсіх цэхах панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя Клары Цэткін абмяркоўваўся зварот маскоўскіх стаханаўцаў. Рабочыя і работніцы віталі прапанову аб правядзенні сталінскага месячніка стаханаўскіх рэкордаў.

21 снежня стаханаўка панчошнага цэха тав. Мытаўская, працуючы на чатырох аўтаматах, устанавіла рэкорд на працэсе насадкі мужчынскіх наскоў. За 7 гадзін яна выпусціла 27 дзесяткаў наскоў, замест нормы ў 19 дзесяткаў. Тав. Мытаўская абяцала ў бліжэйшыя дні перакрыць свой рэкорд.

Вядомая стаханаўка швейна-кецельнага цэха тав. Ежгурава ў дні сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў выпусціла на сваім працэсе 81 дзесятак мужчынскіх наскоў (норма 49). Зараз яна штодзённа выпускае 87 дзесяткаў.

***

У адказ на зварот маскоўскіх стаханаўцаў, стаханавец-фрэзероўшчык віцебскага станкабудаўнічага завода імя Кірава тав. Бірукоў дабіўся на сваім працэсе 550 проц. нормы. Тав. Бірукоў пастаціў сабе задачай сустрэць першы дзень сталінскага месячніка стаханаўскіх рэкордаў выкананнем сваёй нормы на 1.000 проц.

Даб'емся новага ўздыму прадукцыйнасці працы

Сталінская дэкада стаханаўскіх рэкордаў прынесла новыя вытворчыя перамогі швейнай фабрыцы імя 8 сакавіка (Менск). 20 снежня фабрыка датэрмінова выканала свой гадавы план.

Яшчэ 10 снежня рад лент, як, напрыклад, лента тав. Кацнельсон, лента тав. Заслаўскай (2 пэх) выканалі свой гадавы план. Пастаянна адстаючая лента т. Мельцэр у сталінскую дэкаду вышла ў перадавыя, выканаўшы свой дэкадны план на 125,3 проц. Лента тав. Жук (пэх № 1) у сярэднім у часе дэкады выконвала сваю дзённую норму на 122 проц. Дасягнуты поспех яна замацавала.

За сталінскую дэкаду павялічыліся рады стаханаўцаў на 12 чалавек. Цяпер лік стаханаўцаў на фабрыцы складае 79,4 проц. да ўсіх рабочых, працуючых штодзённа.

Вестка аб прапанове стаханаўцаў Масквы і Маскоўскай вобласці і схода стаханаўцаў прадпрыемстваў г. Менска правесці ў студзені 1938 года сталінскі месячнік стаханаўскіх рэкордаў выклікала сярод рабочых фабрыкі новы прыліў энтузіязма.

Лента тав. Малішэўскай, якая яшчэ 25 лістапада выканала свой гадавы план, узяла на сябе абавязацельства ў сталінскім месячніку выконваць сваю дзённую норму не ніжэй 120 проц. Такое-ж абавязацельства ўзяла на сябе лента тав. Мельцэр.

В. Д.

ПЕРАДАВІКІ

БАБРУЙСК. Рабочы калектыў фабрыкі імя Халтурына горача сустрэў зварот маскоўскіх стаханаўцаў. На агульным сходзе рабочыя аднадушна пастанавілі ўключыцца ў сталінскі месячнік стаханаўскіх рэкордаў.

20 снежня стаханавец фабрыкі, рэзчык па дрэву тав. Альтшуль выканаў сваю норму на 300 проц., столяр тав. Холад—на 309 проц., тав. Лось — на 260 проц.

Менскія чыгуначнікі дабіваюцца новых поспехаў

Ва ўсіх службах Менскага чыгуначнага вузла адбыліся сходы рабочых, на якіх горача абмяркоўваўся зварот стаханаўцаў Масквы і Маскоўскай вобласці аб правядзенні з 1 студзеня 1938 года сталінскага месячніка стаханаўскіх рэкордаў.

Брыгадзір склада паліва станцыі Менск тав. Філіновіч у сваім выступленні заявіў:

— Мая брыгада ў сталінскую дэкаду стаханаўскіх рэкордаў сваё дзённае заданне выконвала на 190 проц. Гэтае дасягненне мы замацуем. 20 снежня брыгада дзённы план выканала на 198 проц. Непаладкі, якія мелі месца ў перыяд сталінскай дэкады, мы зараз знішчаем. Сталінскі месячнік стаханаўскіх рэкордаў мы правядзем яшчэ лепш.

Аднадушна і горача падтрымліваюць зварот стаханаўцаў гор. Масквы і схода стаханаўцаў Менска таксама паравозныя дэпо.

— У сталінскі месячнік стаханаўскіх рэкордаў, — сказаў у сваім выступленні высокакваліфікаваны рабочы паравознага дэпо т. Касько, — мы дасягнулі не толькі высокай прадукцыйнасці, але і высокай якасці работы. Я прыкладу ўсе намаганні, каб студзень стаў месяцам рэкордаў і высокаякаснага рамонту паравозаў. Свой вопыт і веды буду перадаваць машыністам па догляду паравозаў і слесарам па яго рамонту.

Н. СТРЭЛЬЧАНКА.

Зрываюць падрыхтоўку да сталінскага месячніка

За апошні час беларэўны цэх бабруйскага лесакамбіната сістэматычна прастайвае, няма сыравіны. 13 снежня зборачнае аддзяленне зусім не працавала. 14 снежня была занята толькі адна змена, свой план яна выканала на 30 проц.

У наступныя дні становішча ў цэху зусім не змянілася. Падрыхтоўка да сталінскага месячніка зрываецца.

Хто вінават у тым, што няма сыравіны, што цэх прастайвае? Мы лічым гэта рэзультатам бяздзейнасці кіраўніцтва камбіната, дырэктара Чэле і яго намесніка Чэрнякова.

Стаханаўцы беларэўнага цэха: ГІТЛІНА, РЫЎКІН, ДАБРАВОЛЬСКІ.

ВЫНІКІ ВЫДАТНАЙ РАБОТЫ

(Нарада членаў выбарчых камісій, даверaных асоб і агітатараў Менска)

Сталінскі блок комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет СССР атрымаў бліскучую перамогу. Выбары паказалі, што працоўныя сталіцы Совецкай Беларусі — Менска, як і ўвесь совецкі народ, бязмежна адданы сваёй роднай, магутнай партыі большэвікоў, партыі Леніна — Сталіна, свайму любімаму правадыру і настаўніку Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну. Выбары з'явіліся магутнай дэманстрацыяй палітычнага і маральнага адзінства совецкага народа.

99,6 проц. усіх выбаршчыкаў Менска з'явіліся 12 снежня на выбары і аддалі свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных — першага маршала Совецкага Саюза, наркома абароны СССР, любімца ўсяго совецкага народа Клімента Ефрэмавіча Варашылава і вернага сына партыі большэвікоў Уладзіміра Грыгор'евіча Ванеева.

Для падвядзення вынікаў гэтай вялікай работы і абмену вопытам большэвіцкай агітацыі на ўчастках, учора Менскі гаркам партыі склікаў нараду членаў выбарчых участковых камісій, даверaных асоб і агітатараў. Памяшканне Яўрэйскага тэатра запоўнілі 800 лепшых майстраў большэвіцкай агітацыі і арганізацыі мас.

Нарада пачала сваю работу выступленнямі з месц. Першы ўзяў слова тав. Краўпоў, які працаваў старшынёй выбарчай камісіі ўчастка № 10. Ён падрабязна расказвае аб той вялікай і крэпатлівай рабоце, якая праводзілася на ўчастку ў часе выбарчай кампаніі.

Затым выступае работніца, стаханаўка завода «Большэвік» тав. Хвашчэўская, якая працавала даверанай асобай на 67 выбарчым участку. Яна расказала аб новых формах і метадах агітацыйна-масавай работы на ўчастку ў часе выбарчай кампаніі.

З вялікай увагай было выслухана выступленне тав. Кабернік, якая працавала даверанай асобай на 21 участку.

Тав. Кабернік закончыла сваё выступленне заклікам да ўсіх агітатараў прадаўжаць і далей агітацыйна-масавую работу сярод працоўных горада, асабліва з хатнімі гаспадынямі, якія праяўляюць вялікае жаданне і цікавасць да работы палітычных гурткоў. Зараз тав. Кабернік па сваёй асабістай ініцыятыве, арганізавала гурток у ліку 10 хатніх гаспадынь і праводзіць пастаянную работу з імі.

У канцы нарады з прамовай, падсумоўваючай вынікі выбараў і агітацыйна-масавай работы па гораду, выступіў выконваючы абавязкі другога сакратара Менскага гаркома партыі т. Мацвееў. Ён назваў вялікую колькасць участкаў, якія справіліся з сваёй работай на выдатна, дабіўшыся ўдзелу ўсіх выбаршчыкаў у галасаванні.

Задача менскай партыйнай арганізацыі заключаецца зараз у тым, каб усе новыя формы і метады агітацыйна-масавай работы не толькі замацаваць, але пашыраць і развіваць іх. На аснове здабытага багатага вопыту палітычнай работы ў масах, трэба яшчэ больш павышаць актыўнасць працоўных, накіроўваючы яе на выкананне промфінпланаў заводамі і фабрыкамі, на павышэнне прадукцыйнасці працы, на большэвіцкую сустрэчу трэцяй сталінскай пяцігодкі.

Свой даклад тав. Мацвееў закончыў перадачай выбаршчыкам Менска большэвіцкага прывітання ад імя слаўнага і любімага дэпутата ў Вярхоўны Совет СССР — Клімента Ефрэмавіча Варашылава, якому гэтымі днямі тав. Мацвееў, як член акруговай выбарчай камісіі, уручаў пасведчанне на права атрымання дэпутацкага мандата.

Перадача прывітання ад імя любімага наркома абароны СССР Клімента Ефрэмавіча Варашылава была сустрэта бурнай авацыяй і воклічамі гучнага «ура» усіх прысутных у гонар партыі Леніна — Сталіна, вялікага правадыра народаў — першага ўсенароднага дэпутата Вярхоўнага Совета СССР таварыша Сталіна і яго бліжэйшага саратніка таварыша Варашылава.

НА З'ЕЗДЗЕ ПРОФСАЮЗА РАБОТНІКАЎ СЯРЭДНІХ І ПАЧАТКОВЫХ ШКОЛ

Выступленне выконваючага абавязкі першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. ВОЛКАВА

Учора прадаўжаў работу Ўсебеларускі з'езд прафесіянальнага саюза работнікаў сярэдніх і пачатковых школ. Вострая крытыка, што разгарнулася на з'ездзе, выявіла поўную бяздзейнасць былога складу ЦК саюза. Работа былога ЦК прызнана незадавальняючай.

Ранішняе пасяджэнне 22 снежня цалкам было прысвечана абмеркаванню кандыдатур у новы склад ЦК саюза.

На вячэрнім пасяджэнні з прамовай выступіў выконваючы абавязкі першага сакратара ЦК КП(б)Б таз. Волкаў.

Ад імя ЦК КП(б)Б і СНК БССР тав. Волкаў перадаў дэлегатам з'езда палкае большэвіцкае прывітанне.

— Ваш з'езд, — сказаў тав. Волкаў,— праходзіць у момант, калі ўся краіна, увесь шматмільённы народ нашай шчаслівай радзімы перажывае выключную ўрачыстасць перамог соцыялізма.

Вялікімі поспехамі соцыялізма тлумачыцца і тая нябачаная перамога блока комуністаў і беспартыйных, якую мы атрымалі на выбарах у Вярхоўны Совет СССР.

Таварыш Волкаў жывымі прыкладамі ілюструе магутны ўздым працоўных мас, які назіраўся ў часе выбараў у Вярхоўны Совет. Працоўныя масы, галасуючы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, прадэманстравалі яшчэ раз сваю бязмежную адданасць і любоў да большэвіцкай партыі, да таварыша Сталіна.

Падрабязна спыніўшыся на подлай дзейнасці ворагаў народа, якія грудавалі ў сістэме народнай асветы, выконваючы заданні фашысцкіх разведак, і яўных выкрыла і разграміла слаўная совецкая разведка, тав. Волкаў вызначае галоўныя задачы работнікаў народнай асветы па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

— Нам з вамі перш за ўсё трэба ліквідаваць вынікі шкодніцтва на ўсіх участках нашага соцыялістычнага будаўніцтва. Каб выканаць гэту задачу, нам трэба ўзброіць сябе сталінскай пільнасцю, бязлітасна распраўляцца з ворагамі народа, яшчэ больш шацаваць абарону нашай краіны.

— Яшчэ і да гэтага часу,—адзначае тав. Волкаў, мы маем значную засмечанасць кадраў работнікаў народнай асветы.

Работа органаў народнай асветы і профсаюза павінна быць узята пад неаслабны кантроль настаўніцкіх мас. Трэба шырэй разгарнуць большэвіцкую крытыку і самакрытыку, удзесяцярыць большэвіцкую пільнасць, дапамагаць рабоце школ.

Тав. Волкаў высоўвае задачы падрыхтоўкі і вылучэння кадраў з маладых, праверaных, здольных, да канца адданых справе партыі Леніна—Сталіна, работнікаў.

Настаўніцтва павінна ўключыцца ў соцспаборніцтва на дастойную сустрэчу трэцяй сталінскай пяцігодкі; яно павінна паказаць выдатныя ўзоры работы па выхаванню самага маладога пакалення сталінскай эпохі.

— Я заклікаю вас яшчэ больш чесна і самааддана прапавадаць на карысць вялікай социялістычнай радзімы. Мы пабудавалі социялістычнае грамадства і ўпэўнена ідзем да комунізма. Гэтыя поспехі дасягнуты таму, што ў народаў СССР ёсць вялікая партыя Леніна—Сталіна, ёсць вялікі Сталін.

Прамова тав. Волкава не раз перарываецца доўгімі апладысментамі і воклічамі «Ура таварышу Сталіну!», «Няхай жыве таварыш Сталін!». Апошнія словы сустракаюцца дружнай авацыяй усяго з'езда і воклічамі «ура» ў гонар вялікай партыі і таварыша Сталіна.

На вячэрнім пасяджэнні, пасля выступлення тав. Волкава, прадаўжалася абмеркаванне кандыдатур у рэвізійную камісію і кандыдатур на Ўсесаюзны з'езд профсаюзаў.

Сёння — працяг работы з'езда.

ДЭПУТАТ—СЛУГА НАРОДА, ЯГО ПАСЛАНЕЦ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР

БУДУ ЧЭСНА СЛУЖЫЦЬ НАРОДУ

Працоўныя Менскай сельскай выбарчай акругі выбралі мяне дэпутатам Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР ад блока комуністаў і беспартыйных. Гэтым шчасцем і радасцю я абавязан нашай комуністычнай партыі большэвікоў, роднаму і любімаму правадыру народа таварышу Сталіну.

Дарагія таварышы выбаршчыкі! Ад шчырага сэрца выказваю сваю ўдзячнасць за вялікае давер'е, якое вы мне аказалі. Абяцаю вам, што гэта давер'е я, пагранічнік-большэвік, з гонарам апраўдаю і за інтарэсы свайго народа, сваёй партыі аддам усе сілы, усю энергію, а калі патрэбна будзе — і жыццё.

З выключнай увагай і хваляваннем чытаў я і вывучаў прамову таварыша Сталіна напярэдадні выбараў. Словы правадыра з'яўляюцца праграмай работы кожнага дэпутата Вярхоўнага Совета СССР. Я добра запомніў залатыя словы таварыша Сталіна аб тым, што дэпутат з'яўляецца слугой народа, яго пасланцом у Вярхоўны Совет. Наказ маіх выбаршчыкаў я заўсёды буду памятаць і выконваць на любым участку работы.

Я малады дэпутат, мне толькі 26 год. У мінулым беспрытульны, я вырас пад сталінскім сонцам, выхаван вялікай непераможнай партыяй Леніна—Сталіна і ўсё маё жыццё належыць толькі партыі. Чатыры гады я нясу ганаровую сталінскую вахту на граніцы, днём і ноччу ахоўваю свяшчэнную недатыкальнасць рубяжоў нашай соцыялістычнай радзімы. Разам з намі, пагранічнікамі, граніцу ахоўвае ўвесь магутны совецкі народ. Няхай аб гэтым памятаюць ворагі совецкага народа, агенты фашысцкіх разведак — трацкісцка-бухарынская погань.

Я абяцаю вам, дарагія выбаршчыкі, што буду і ў далейшым нястомна працаваць на ўмацаванне граніцы, яшчэ больш павышаць большэвіцкую пільнасць. Абяцаю быць адданым байцом сталінскай гартоўкі, бясстрашным і бязлітасным у барацьбе з усімі ворагамі народа, змагацца так, як нас вучыў вялікі Ленін і вучыць дарагі Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. Прама і непахісна пайду я па шляху барацьбы за шчасце совецкага народа, буду высока трымаць сцяг партыі Леніна—Сталіна ў барацьбе за канчатковую перамогу комунізма.

Няхай жыве першы пасланец магутнага совецкага народа ў Вярхоўны Совет СССР Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

А. М. АБРАМАЎ,
Н-скі пагранатрад, Заходняя граніца БССР.

ВЫКАНАЕМ УКАЗАННІ ПРАВАДЫРА

Горача дзякую выбаршчыкам Мозырскай гарадской выбарчай акругі за аказанне мне высокае давер'е — выбранне мяне дэпутатам Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР. Гэта давер'е народа я палкам адношу да нашай большэвіцкай партыі, да вялікага Сталіна. Працоўныя Мазыршчыны, аддаючы свае галасы за мяне, тым самым галасавалі за партыю большэвікоў, якая дала нам радаснае і шчаслівае жыццё, якая вядзе нас ад перамогі да перамогі.

Большэвіцкая партыя выхавала і загартавала мяне і разам з беспартыйнымі масамі вылучыла мяне для балатыроўкі ў вышэйшы орган дзяржаўнай улады. Партыі большэвікоў я абавязан усім. Яна навучыла мяне барацьбе з ворагамі народа, яна выхавала ва мне незгасаемыя пачуцці нянавісці да ворагаў. Дзякуючы партыі я, радавы рабочы, вырас у партыйнага кіраўніка, арганізатара мас.

Няма слоў, каб поўнасцю выказаць мае гарачыя пачуцці любві да вялікага совецкага народа, да нашай слаўнай большэвіцкай партыі і роднага правадыра таварыша Сталіна. Некалькі раз я перачытваў гістарычную прамову нашага любімага Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, якую ён сказаў перад выбаршчыкамі Сталінскай акругі горада Масквы. Гэту прамову правадыра я запомню на ўсё жыццё. Указанні дарагога Сталіна ўскладаюць на нас — дэпутатаў Вярхоўнага Совета, прадстаўнікоў народа — вялікія абавязкі. Мы, дэпутаты, павінны заўсёды, кожную мінуту помніць аб інтарэсах народа, аб інтарэсах партыі. Прамова таварыша Сталіна — гэта праграма работы для дэпутатаў — верных слуг народа.

Таварышы выбаршчыкі! Я ўрачыста абяцаю вам быць да канца адданым барацьбітом за справу партыі Леніна — Сталіна, за справу комунізма. Я буду аддана змагацца за інтарэсы народа, за вашы інтарэсы. Галасуючы за мяне, кожны з вас у думках казаў мне: будзь верным сынам народа, ідзі ленінска-сталінскім шляхам, разам з партыяй, з родным Сталіным. І я абяцаю вам апраўдаць ваша давер'е. Я нічога не пашкалую. Калі патрэбна будзе, нават і жыццё аддам, для таржаства вялікай справы комунізма.

Яшчэ раз вялікае дзякуй за давер'е.

Д. Ф. МАРКІН,
дэпутат Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР ад Мозырскай гарадской выбарчай акругі.

МАІМ ВЫБАРШЧЫКАМ

Дарагія таварышы! Я заслужыла вялікага гонару быць выбранай вамі дэпутатам у Совет Нацыянальнасцей.

Дзень 12 снежня — гістарычны дзень зыбараў — ператварыўся ў свята радасці пераможнага совецкага народа. Гэта сапраўды быў самы сонечны дзень у жыцці мільёнаў прапаўнікоў соцыялізма, сагрэтых яркімі праменнямі вялікай Сталінскай Канстытуцыі.

Высокая годнасць дэпутата Вярхоўнага Совета СССР ускладае на мяне вялікую адказнасць, аб якой гаварыў наш правадыр таварыш Сталін перад сваімі выбаршчыкамі.

Глыбока запалі мне ў памяць словы Іосіфа Вісарыёнавіча пра абавязкі дэпутата Вярхоўнага Совета. Я прыкладу ўсе свае сілы, усю энергію, каб выканаць іх з гонарам.

Толькі любоўнымі адносінамі да працы, чэснай, добрасумленнай стаханаўскай працай дабілася я рэкордных паказальнікаў па адкорму соўтасных свіней. За гэтую працу ўрад узнагародзіў мяне ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Я і надалей абавязваюся перад сваімі зыбаршчыкамі, перад партыяй Леніна—Сталіна, якая выхавала мяне, вырасціла ад радавой работніцы соўгаса да дэпутата Вярхоўнага Совета СССР, — гэтак-жа чэсна і самаадпана працаваць на карысць нашай радзімы.

Абяцаю сваім выбаршчыкам быць вернай дачкой зялікага совецкага народа, быць вартай звання дэпутата вярхоўнага органа ўлады краіны перамогшага соцыялізма.

БЕЛАЯ Елізавета Васільеўна,
дэпутат Совета Нацыянальнасцей ад Барысаўскай сельскай выбарчай акругі.

«ПАГРАНІЧНІК» — адна з скульптур станцыі метро (Масква).

Ів. ШАПАВАЛАЎ

ВАРТАВЫ КОМУНІЗМА

Ёсць вяцязь бясстрашнага сэрца,
Мы сёння спяваем аб ім —
Ён сталінскім вучнем завецца,
І другам яго баявым.

Знаёмая песня такая
І я яе ў сэрцы нашу,
Як словы яе заспяваю —
Агонь мне праймае душу.

Хай хваляй магутнага спеву
Гучыць з нашых мужных дарог
І сіла народнага гневу,
І радасны гімн перамог.

Вартуе Саюз непахісна
Атрад беззаветных байцоў.
Не спіць вартавы комунізма
Нарком наш таварыш Ежоў.

Ён — маршал совецкай разведкі,
Герой легендарнай Чэка.
Б'е ворага шведа і метка
Наркома Ежова рука.

Куды ні прасунецца лапа
Фашысцкіх раз'юшаных псоў,
Крывавую лапу Гестапо
Раструшчыць таварыш Ежоў.

Ні ноччу, ні днём не ўхіліцца
Фашысту ад ЭнКаВэДэ,
У ежовыя ўзят рукавіцы —
І чорт не паможа ў бядзе.

Каб жыў наш Саюз непахісна,
Каб вораг у тыл не зашоў,
Не спіць вартавы комунізма
Нарком наш любімы Ежоў.

Сардэчны, бясстрашны, суровы,
На варце радзімы — Ежоў,
Яму — нашы лепшыя словы,
Народная наша любоў.

Кладзе ён жыццё сваё горда
У касцёр комунізма зары,
Вялікага Леніна Орлен
Над сэрцам Ежова гарыць.

У паступ выходзяць чэкісты —
Атортвае ворагаў жах.
Няхай жыве геній вячысты —
Наш Сталін і сталінскі шлях.

Пад сталінскім сонцам агністым
Дзень шчасця людскога ўзышоў.
Не спіць вартавы комунізма
Наш родны тазарыш Ежоў.

З рускай мовы пераклаў
Аркадзь КУЛЯШОЎ.

СКУЛЬПТУРНЫ ПАРТРЭТ тав. Н. І. ЕЖОВА

Беларускі скульптар Азгур працуе над вялікім скульптурным партрэтам сталінскага наркома тав. Н. І. Ежова. Скульптура будзе закончана вясной да намячаючайся ўсебеларускай вясенняй мастацкай выстаўкі.

НЕ ЗНІЖАЦЬ УЗРОВЕНЬ ПАЛІТЫЧНАЙ АГІТАЦЫІ

У перыяд падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР наша большэвіцкая партыя ўсклала вялікую адказнасць на партыйныя арганізацыі па разгортванню палітычнай агітацыі сярод працоўных. Пярвічная партыйная арганізацыя БелДРЭС адказвала за палітычную работу сярод выбаршчыкаў на ўчастку № 23-7, які абслугоўваў 2.399 чал. выбаршчыкаў. Сюды ўваходзілі рабочыя, калгаснікі, служачыя, хатнія гаспадыні, моладзь.

Партыйная арганізацыя пачала з падрыхтоўкі кадраў прапагандыстаў і агітатараў. У пачатку верасня партком арганізаваў 10-дзённыя курсы агітатараў, на якіх навучаліся 46 комуністаў і комсамольцаў.

Пасля гэтага ў кожнай змене, цэху, вахце былі створаны гурткі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб зыбарах. Спачатку мы стварылі 44 гурткі з ахопам 934 рабочых і служачых і 15 гурткоў хатніх гаспадынь з 252 слухачамі.

Калі было пройдзена некалькі тэм Палажэння аб выбарах, партком, з мэтай паглыбіць веды слухачоў, правёў у кастрычніку тэарэтычную канферэнцыю. У яе рабоце прынялі актыўны ўдзел больш 400 выбаршчыкаў. Тэма Палажэнне аб выбарах была разбіта на 5 дакладаў, якія рыхтавалі палітычна пісьменныя агітатары. Аб актыўнасці на канферэнцыі сведчыць той факт, што па дакладах выступіла больш 30 выбаршчыкаў.

Але ўсяго гэтага было далёка недастаткова. Партыйная арганізацыя паставіла перад сабой задачу ахапіць палітычнай агітацыяй літаральна ўсіх выбаршчыкаў. Мы далаткова вылучылі 26 агітатараў — палітычна падрыхтаваных комсамольцаў, педагогаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў.

Кожны комуніст—член нашай партыйнай арганізацыі—стаў актыўным агітатарам. Кожны дзень вырастаў новы актыў агітатараў і прапагандыстаў у комсамоле, сярод беспартыйных рабочых, служачых, сярод хатніх гаспадынь.

Партком штодзённа кантраляваў агітатараў, аказваў ім дапамогу ў рабоце. Бесперабойна працавалі семінар, кансультацыя па пытаннях зыбараў. Выбаршчыкі актыўна наведвалі заняткі гурткоў, праяўлялі небывалую зацікаўленасць да іх. Асабліва трэба адзначыць рост актыўнасці сярод старыкоў, якія ўпершыню былі ахоплены сапраўды шырокай палітычнай агітацыяй.

Для аказання дапамогі вёсны ў правядзенні выбарчай кампаніі, партком паслаў у Талачынскі раён брыгаду ў складзе 9 таварышоў. Яна працавала там на працягу 10 дзён. Паслалі брыгаду ў Высоцкі сельсовет, Аршанскага раёна, якая працавала там цэлы месяц.

Выбарчы ўчастак № 23-7 быў ператвораны ў цэнтр палітычнай агітацыі. Пастаянна там знаходзілася брыгада агітатараў у колькасці 21 чалавека. Штодзённа праводзіліся кансультацыі. Выбаршчыкі атрымлівалі вычарпальныя адказы на ўсе пытанні.

Трэба адзначыць вельмі добрую работу (уцягненне ўсіх выбаршчыкаў у гурткі, выкарыстанне дадатковых наглядных дапаможнікаў) агітатараў-комуністаў Палашэўскага, Шарыпа, Камянецкага, Сафронава, якія працавалі па заданню партыйнай арганізацыі ў Высоцкім сельсавеце. Агітатар тав. Федаранка ў калгасе імя Леніна, Сталінскага сельсовета, уцягнуў у свой гурток 60 калгаснікаў і калгасніц, дабіўся таго, што слухачы актыўна наведвалі заняткі. Агітатар-інжынер тав. Ермакоў кіраваў 2 гурткамі.

З 6 гадзін раніцы 12 снежня выбаршчыкі пачалі прыходзіць на выбарчы ўчастак. Яны з любоўю адналушна галасавалі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, тым самым галасавалі за тварца Сталінскай Канстытуцыі, геніяльнага чалавека нашай эпохі таварыша Сталіна.

Разгортванне палітычнай агітацыі ў перыяд падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР дакаціла ў партыйнай арганізацыі вялікі вопыт агітацыйнай работы сярод мас працоўных. Партком лічыць зараз неабходным замацаваць работу агітатараў у гуртках на прадпрыемствах, у рабочых пасёлках, у калгасах, у асобных дамах і кватэрах. Штодзённа, несупынна, на зоне падрыхтоўкі да выбараў мы будзем несці ў масы працоўных праўдзівае большэвіцкае слова.

ЗДАНОВІЧ Л. М.,
сакратар парткома БелДРЭС.

ХТО ЗРЫВАЕ РАБОТУ ФАБРЫКІ

З вялікім уздымам і энтузіязмам рэбочыя і работнікі менскай кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка» адсвяткавалі Ўсенароднае свята — дзень выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Выбары вышэйшага органа совецкай улады і перамогі блока комуністаў і беспартыйных натхнілі рабочых калектыў на вытворчыя перамогі, на рэкордную выпрацоўку. Брыгада цыркуляршчыкаў тарнага цэха ў складзе тт. Мазуркевіча, Крэсіка, Камінскага сістэматычна выконвае свой план на 326 проц. Цыркуляршчыкі гэтага цэха Некраш, Пецюк і інш. даюць 322 проц. нормы. Але на шляху да росту прадукцыйнасці працы нямала ёсць і перашкод.

Кіраўнікі фабрыкі (дырэктар Бедржыцкі, старшыня фабкома Глайхенгауз, сакратар парткома Рабкін) апынуліся ў хвасце рабочага калектыва. Адарваныя ад мас, яны не цікавяцца работай стаханаўцаў і ўдарнікаў, не складаюць належных умоў для іх працы. Па віне адміністрацыі за апошні час сталі прастаяваць цэлыя брыгады і цэхі. За 20 дзён снежня на прадпрыемстве было вымушаных прастояў звыш двух тысяч чалавекагадзін. У рэзультаце фабрыка з дня ў дзень не выконвае вытворчага плана. За дзве дэкады снежня месячны план выкананы толькі на 58,5 проц.

— Спецыфічныя ўмовы фабрыкі,—заўважаюць у адзін голас кіраўнікі прадпрыемства, калі спытаеш у іх аб прычынах невыканання плана. На справе-ж прычыны хаваюцца ў дрэнным кіраўніцтве.

З кожным днём фабрыка пашыраецца, павялічваецца выпуск прадукцыі. Аднак, пад тарны цэх і сушылку адведзена неадпавядаючае памяшканне, нехапае складаў для сыравіны і гатовай прадукцыі.

Летам Наркамат харчовай прамысловасці БССР адпусціў поўмільёна рублёў для прамысловага будаўніцтва. Гэту адказную работу павінен быў узначаліць галоўны інжынер (ён-жа выконваў абавязкі дырэктара фабрыкі) Пузанаў. Прайшло лета. І нават восенню ён не знайшоў патрэбным склад праект будаўніцтва. І толькі ў лістападзе фабрыка прыступіла да будаўніцтва, але зноў-такі без праекта. У рэзультаце — будаўніцтва спынена. Між тым, з-за адсутнасці памяшкання пад тарны цэх і сушылку цэхі сістэматычна прастойваюць. За 11 месяцаў вымушаных прастояў на прадпрыемстве было 40.640 чалавекагадзін. Гэта прынесла матэрыяльных страт фабрыцы 700 тысяч рублёў.

Пры невыкананні плана Пузанаў, будучы часова выконваючым абавязкі дырэктара фабрыкі, умудрыўся перавыдаткаваць фонд зарплаты на 211 тыс. рублёў.

Пралезныя шкодзнікі ў адзел механікі ва-ўсю распаясаліся. Яны «рамантуюць» машыны так, што тыя сістэматычна выходзяць са строю. Адзіная каштоўная машына «Дызентаграгтар» злачынна эксплатуецца. З-за нясвоечасовага правядзення папераджальнага рамонту «Дызентаграгтар» больш прастойвае. З-за гэтага прастойваюць цэлыя змены карамельнага і дражэйнага цэхаў. 20 снежня быў прастой на фабрыцы з-за няспраўнасці труб і нізкай тэмпературы сушкі. У гэты дзень цукеркавы цэх свой план выканаў толькі на 55 проц. Такія-ж вынікі далі і іншыя цэхі фабрыкі.

Намеснікам начальніка самага буйнага карамельнага цэха працуе Дзятковіч, які праславіўся нячуласпю і бюракратызмам. Па яго віне знатная стаханаўка — работніца фабрыкі тав. Палабед пакончыла жыццё самагубствам. У гэтым цэху зачастую рад рабочых і брыгад маюць прастоі. Зменным майстрам у дражэйным цэху працуе нейкая Мялзвеэзева, якая да апошняга часу трымае песную сувязь з заўзятымі ворагамі народа, якія выкрыты на чыгунцы.

Два месяцы таму назад на фабрыку прыслан дырэктарам Бедржыцкі. Але за гэты час ён палеп аб палеп не ўдарыў, каб па-большэвіцку ўзяцца за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва. Наадварот, пры яго кіраўніцтве яшчэ больш абнаглела дзейнасць ворагаў народа.

Сакратар парткома Рабкін меў шмат сігналаў аб шкодніцтве, але старанна пакрываў злачынную дзейнасць ворагаў. Тым больш падазрона гэта, калі прыпомніць, як у свой час ворагі народа расхвальвалі «выдатную» партыйную работу Рабкіна.

В. АСТРОЎСКІ.

ВЫДАТНА ПАДРЫХТАВАЦЦА ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

1937 год соцыялістычная вёска азнаменавала новымі вытворчымі перамогамі. На палях Совецкага Саюза сабрана каля 7 мільярдаў пудоў хлеба — амаль на 2 мільярды больш, чым збірала царская Расія ў самыя ўраджайныя гады. Совецкая краіна, такім чынам, ушчыльную падышла да выканання лозунга таварыша Сталіна аб штогодняй вытворчасці 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

Калгасная вёска ахоплена велізарным палітычным і вытворчым уздымам. У гістарычны дзень 12 снежня разам з усім совецкім народам калгаснае сялянства яшчэ і яшчэ раз дэманстравала магутную сілу калгаснага ладу, сваю бязмежную любоў і адданасць да совецкай радзімы, да большэвіцкай партыі, да свайго роднага, любімага правадыра вялікага Сталіна. Аднадушна галасуючы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, совецкае сялянства шчыра дзякавала большэвіцкай партыі і совецкай уладзе за сваё шчаслівае і заможнае жыццё, галасавала за поўны бязлітасны разгром і знішчэнне ворагаў совецкай радзімы, галасавала за далейшы росквіт совецкай вёскі пад мудрым кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна.

Падыходзячы 1938 год павінен прынесці новыя перамогі. Ураджай павінен быць сабраны яшчэ больш. Усе ўмовы для заваявання выдатнага ўраджаю ў наяўнасці. Цяпер справа ў большэвіцкай рабоце, ва ўмелым аператыўным кіраўніцтве земельных органаў, партыйных і совецкіх арганізацый у падтрыманні ініцыятывы перадавых калгаснікаў.

На жаль, актыўнасць калгасных мас зачастую не сустракае належнага большэвіцкага падтрымання з боку кіраўнікоў партыйных і совецкіх арганізацый некаторых раёнаў рэспублікі. Аб гэтым сведчыць яўна нездавальняючы ход падрыхтоўкі да веснавой сяўбы па БССР.

Да гэтага часу ў калгасах рэспублікі не закончана засыпка насенных фондаў. Усяго засыпана зернавых 77 проц. плана. Асабліва адстаюць Чачэрскі, Смілавіцкі, Сіроцінскі, Пухавіцкі, Мсціслаўскі, Менскі, Магілеўскі, Клічаўскі, Клімавіцкі, Дубровенскі, Слуцкі, Ветрынскі і Бягомльскі раёны. Не закончана засыпка ільнасемя.

Асабліва непярпімае становішча з ачысткай насенных матэрыялаў. Дастаткова сказаць, што па насенню збожжавых ачышчана толькі 15 проц. засыпанага. Ганебна зрываецца трыераванне зернавых па Бягомльскаму, Лепельскаму, Ветрынскаму, Бялыніцкаму, Дубровенскаму, Клічаўскаму, Магілеўскаму, Халопеніцкаму і Чэрвеньскаму раёнах.

Такое становішча тлумачыцца тым, што земельныя аддзелы многіх раёнаў і Наркамзем Беларусі пытаннямі якасці насення не займаюцца.

Наркамзем БССР, раённыя земельныя аддзелы абавязаны зрабіць усё неабходнае, каб як мага хутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцтва ў насеннай справе і забяспечыць сяўбу 1938 года высокаякасным насеннем. Трэба зараз-жа арганізаваць міжкалгасны абмен звычайнага насення на сартавое. Трэба ў кожным калгасе арганізаваць спецыяльныя звенні па ачыстцы насення, арганізаваць кругласутачную і бесперабойную работу зернаачышчальных машын, двойчы праверыць насенны матэрыял на ўсхожасць і на чыстату, арганізаваць узорнае захоўванне насення ад раскрадванняў і псаванняў.

Выключнае значэнне набывае своечасовы і высокаякасны рамонт трактарнага парка. Кожнаму калгаснику цяпер вядома, якую вялікую ролю ў барацьбе за высокі ўраджай адыгрывае трактарны парк. Не выпадкова ворагі народа, якія арудавалі ў земельных органах і многіх МТС, у мінулым годзе прыклалі свае брудныя лапы да рамонту трактароў. Палітычная бестурботнасць многіх партыйных арганізацый прывяла да таго, што трактары былі адрамантаваны па-шкодніцку, выходзілі са строю з першым паўўдзеннем у полі. Але вынікі шкодніцтва ў МТС не ліквідаваны і па гэты час. Урокі мінулага года не ўлічаны ні ў Наркамземе Беларусі, ні ў машынна-трактарных станцыях няма большэвіцкай трывогі за падрыхтоўку трактарнага парка да вясны. Дастаткова сказаць, што план рамонту трактарнага парка выкананы толькі на 15 проц. У Станькаўскай, Дубровенскай, Смалянскай, Асіпавіцкай, Баброўскай, Путчынскай, Лагойскай і некаторых іншых МТС да рамонту трактарнага парка нават не прыступілі.

Ніякіх апраўданняў для такога ганебнага адставання няма. Зрыў рамонту трактароў—вынік няўмення, а часам і нежадання па-большэвіцку змагацца за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы. Вось, напрыклад, Магілеўская МТС. Яе майстэрня павінна рамантаваць трактарны парк пяці МТС. У 4-м квартале яна павінна была адрамантаваць 8 трактароў капітальным рамонтам і 7—сярэднім рамонтам. Між тым ні адзін трактар з рамонту не выпушчан. Дырэктар МТС Бузько і тэхнічны дырэктар МТМ Хавін сабатуюць рамонт. Запасныя часткі не падрыхтавалі.

Паступаюць сігналы аб тым, што не ўсё добра і з якасцю рамонту. Так, напрыклад, у Вялікаборскай МТС у палове адрамантаваных трактароў не пастаўлены зашчолкі да капотаў, сцяжныя хамуты.

Аршанская машынна-трактарная майстэрня абслугоўвае 24 МТС па рамонту матораў. Тут па-шкодніцку адносяцца да рамонту. «Адрамантавалі» 3 маторы для Дубровенскай МТС. Пры праверцы рамонт аказаўся негодным, прышлося маторы з Дуброўны вярнуць у Аршанскую МТМ. Ці не ясна, што дырэктар МТМ Егіпцаў і тэхнічны дырэктар Патапенка не жадаюць змагацца за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва ў сельскай гаспадарцы.

Безадказна адносяцца да якасці рамонту і ў Горацкай МТМ—дырэктар МТС Сілівановаў, тэхнарук Тарасенка. Адрамантавалі 8 трактароў «ХТЗ» і ва ўсіх атрымалася «заяданне» цыліндраў.

Нельга чакаць да вясны з праверкай якасці адрамантаваных трактароў. Дакладная праверка выходзячых з рамонту трактароў і іншых машын павінна праводзіцца ў ходзе самага рамонту, каб да вясны ўвесь машынны парк быў у поўнай спраўнасці.

Наркамзем БССР, раённыя земельныя аддзелы і МТС, совецкія і партыйныя арганізацыі абавязаны навярстаць упушчанае і разгарнуць сапраўды большэвіцкую падрыхтоўку да сяўбы ў кожным сельсавеце, калгасе і соўгасе.

Іменна цяпер зімой вырашаецца поспех ураджаю прадстаячага года. Калгасы накапілі выдатны вопыт барацьбы за высокі ўраджай. Гэты вопыт павінен быць выкарыстан да канца. Ужо цяпер кожны калгас павінен мець сур'ёзны, да канца прадуманы план барацьбы за ўраджай 1938 года. Трэба прадугледзець усе пытанні: набыццё і вывазку ўгнаення ў, рамонт машын і інвентару, падрыхтоўку кадраў, расстаноўку людзей, падрыхтоўку конскага пагалоўя, размяшчэнне культур, высокаякаснае насенне, нормы выпрацоўкі і т. д. Адным словам трэба ўлічыць і прадумаць літаральна ўсё, каб ідэальна падрыхтавацца да веснавой сяўбы, каб сеяць арганізавана: хутка і высокаякасна.

Набліжаецца новая, выдатная большэвіцкая вясна. Не можа быць сумнення, што калгасная вёска адзначыць першую вясну трэцяй большэвіцкай пяцігодкі новымі бліскучымі ўзорамі стаханаўскай работы за высокі ўраджай. Парукай гэтаму — гіганцка вырасшая палітычная актыўнасць калгасных мас. Партыя і ўрад, асабіста таварыш Сталін, аказалі беларускаму сялянству выключна вялікую дапамогу ў ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, дапамаглі беларускаму народу разграміць трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў, якія арудавалі ў БССР. Пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна калгаснае сялянства Совецкай Беларусі да канца знішчыць ворагаў народа, фашысцкіх шпіёнаў і зробіць у прадстаячым годзе гіганцкі крок уперад у барацьбе за сталінскі ўраджай, за большэвіцкія калгасы, за шчаслівае і заможнае жыццё калгаснікаў.

Партыйныя і совецкія арганізацыі Беларусі абавязаны ўзначаліць палітычную актыўнасць калгаснікаў, дапамагчы ім разгарнуць новую хвалю стаханаўскага руху за выдатную падрыхтоўку да сяўбы.

ВЫШЫВАЛЬШЧЫЦЫ ЧАЧЭРСКАГА РАЁНА

З кожным днём расце і шырыцца мастацкае вышыванне ў Чачэрскім раёне. З адзінак, якія калісьці вышывалі ручнікі, зараз вырасла таварыства мастацкага вышывання, якое дае высокаякасную прыгожую прадукцыю. За сваё кароткае двухмесячнае існаванне таварыства ўжо выканала два адказныя заказы для Беларускага тэатра оперы і балета і для фізкультурнага вучылішча. Зараз таварыства ўзяла яшчэ некалькі вялікіх заказаў. У таварыстве аб'яднана больш 500 вышывальшчыц-калгасніц. Па сельсаветах раёна арганізаваны вышывальныя пункты, якімі кіруюць лепшыя вышывальшчыцы.

Заможна і шчасліва жывуць калгасніцы-вышывальшчыцы. Справа мастацкага вышывання поруч з працай у калгасе стала першай неабходнасцю многіх жанчын. Сярод вышывальшчыц ёсць сапраўдныя таленты. Асабліва вызначаецца дзесяцігадовая Насця Дуброўская. Яна за выключную якасць сваёй работы атрымала прэмію ад таварыства. Лепшыя вышывальшчыцы атрымліваюць высокі заработак за вышыванне. Так, напрыклад, Дуня Казлова зарабіла за кастрычнік 300 руб., М. Патапенка — 275 руб., А. Шаметава — 275 руб. і т. д.

БЕРЫН.

м. Чачэрск.

НАПЯРЭДАДНІ ПЯТАГА ТЫРАЖА ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

У сувязі з набліжэннем пятага тыражу пазыкі другой пяцігодкі гарадская ашчадкаса № 16 (Менск) распрацавала рад мерапрыемстваў для лепшага абслугоўвання пазыкатрымальнікаў.

На буйнейшых прадпрыемствах Менска арганізуюцца даведачныя сталы па праверцы выйгрышных аблігацый. Усе ашчадкасы горада таксама арганізуюць праверку выйгрышаў.

За апошнія дні значна ўзмацніўся выкуп аблігацый пазыкі другой пяцігодкі. За 5 дзён — з 15 па 20 снежня — выкуплена аблігацый на 350 тыс. рублёў.

Расце прыток укладаў у ашчадкасы. За 20 дзён снежня працоўныя Менска зрабілі ўкладаў у ашчадкасы горада на суму 570 тыс. рублёў супроць 161 тыс. рублёў у лістападзе — павелічэнне на 409 тыс. рублёў. (БЕЛТА).

СВОЕЧАСОВА І ДОБРАЯКАСНА АДРАМАНТАВАЦЬ ТРАКТАРЫ

На стале начальніка машынна-тэхнічнага аддзела зерназога ўпраўлення Наркамзема БССР тав. Шутно кіна тэлеграм і дакладных запісак. Гэта кіна з кожным днём і нават гадзінай павялічваецца. Дырэктары і старшыня механікі МТС і МТМ бесперапынна і настойліва просяць аказаць дапамогу ў забеспячэнні запаснымі часткамі, з-за адсутнасці якіх зрываецца выпуск трактароў з рамонту.

З Даманазіцкай МТМ паведамляюць, што 11 матораў стаяць амаль гатовымі, але не могуць быць выпушчаны з рамонту па адной прычыне — няма падшыпнікаў рэгулятара. У майстэрні 10 матораў падрыхтаваны да прыжыгу. Аднак, таксама з-за адсутнасці пальцаў шатуна, нельга праводзіць далейшы рамонт. Майстэрня не мае ні аднаго павелічальнага пальца, ні аднаго поршня першай серыі і ні аднаго нармальнага пальца.

Намеснік дырэктара па палітчасці Мозырскай МТС тав. Парэцкі ў сваёй дакладной запісцы расказвае аб незадавальнай злачынных адносінах Беларускай рэспубліканскай канторы ГУТАП да засылкі запасных частак для трактароў. Часткі пачалі засылацца ў незначнай колькасці і некамплектнымі толькі ў снежні. Падшыпнікі № 3100 да каробак скорасцей прысланы, а шасцяронак і валікаў няма, і каробак нельга збіраць. У 1936 годзе з-за адсутнасці гільз старыя гільзы былі расточаны і да іх былі ўстаноўлены павялічаныя поршні. У гэтым-жа годзе гільзы прысылаюцца, але не з нармальнымі поршнямі, а з павялічанымі. Каб скарыстаць іх, прыходзіцца растачваць новыя гільзы, што з'яўляецца прамым шкодніцтвам.

Інакш як шкодніцтвам нельга разглядаць і засылку некамплектных часцей. На Калінкавіцкую базу ГУТАП'а засланы толькі выхлапныя клапаны, у той час як у Рагачоўскую МТС прысланы адны ўсасываючыя клапаны. Такая яўна-шкодніцкая засылка запасных частак наглядаецца і ў радзе іншых МТС і МТМ.

Як у зернавое, так і ў ільнянае і гарох-не-бульбянае ўпраўленні Наркамзема таксама паступаюць дзесяткі скарг на выключна дрэннае забеспячэнне майстэрань запаснымі часткамі для трактароў. Апрача прысылкі тэлеграм і дакладных запісак кіраўнікі і спецыялісты МТМ і МТС кожны дзень асаджаюць базы, склады, канторы ГУТАП'а і ўпраўленні Наркамзема. Бескарысна трапяціла на каманднароўкі і шматлікія тэлеграмы дзесяткі тысяч рублёў дзяржаўных сродкаў, а трактары не рамонтуюцца.

У чым-жа прычына? Кіраўнікі Беларускай рэспубліканскай канторы Дзяржаўнага ўпраўлення аўтатрактарнай прамысловасці (ГУТАП) працягваюць шкодніцкую практыку ў забеспячэнні МТМ і МТС запаснымі часткамі. Да пачатку рамонтнай кампаніі часці своечасова не завозілі, а зараз, у самы разгар рамонту, завоз іх ніхто не плануе і не кантралюе.

У многіх машынна-трактарных майстэрнях і станціях нельга выпусціць трактары з рамонту з-за адсутнасці дробязных частак. На цэнтральнай базе ГУТАП у Оршы няма такіх частак, як кампрэсіённых кольцаў утулак рэгулятараў, утулак размеркавальнага вала (пярэдніх), паскаральнікаў магнето — усяго больш 13 дэталей.

Усім гэтым, здавалася-б дробязным, але самым неабходным у рамонце трактароў, часткам дырэкцыя канторы ГУТАП'а (дырэктар т. Будніч) не надае значэння і не завозіць іх у патрэбнай колькасці.

Выключна дрэнная і непаваротлівая работа ГУТАП'а тармозіць рамонт трактароў па МТС Совецкай Беларусі. Але ці толькі прычына ў гэтым?

Самі дырэктары многіх МТМ і МТС да апошняга часу не паклапаціліся, каб своечасова забяспечыць рамонт трактароў усімі неабходнымі запаснымі часткамі. Аб іх пачалі клапаціцца толькі тады, як у майстэрнях былі разабраны на рамонт трактары.

Горш усяго, што рамонт трактароў зацягваецца нават там, дзе ёсць запасныя часткі ў належнай колькасці. Да ліку такіх МТС адносяцца Прыямінская, Бярэзінская, Быхаўская і інш. Тут усё яшчэ раскачваюцца, пакуль што вядуць толькі размовы аб падрыхтоўцы да рамонту, а да работы не прыступаюць.

Вялікая колькасць МТС толькі ў апошнія дні пачала рамантаваць трактары, з некаторыя МТС яшчэ не прыступілі да рамонту.

На 20 снежня па БССР выканан гадавы план рамонту трактароў толькі на 15 проц. План чацвертага квартала па капітальнаму рамонту выканан на 44,9 проц. і сярэдняму — 25 проц.

Першыя маторы і трактары, выпушчаныя з рамонту, ва многіх месцах аказаліся непрыгоднымі для работы, з радам сур'ёзных дэфектаў. Такія факты мелі месца ў Аршанскай і Горацкай МТМ.

Недапушчальна слабыя тэмпы і нізкая якасць рамонту трактароў, якія ў асобных месцах мяжуюцца са шкодніцтвам, гавораць аб тым, што ў радзе МТМ і МТС пануе выключная бесклапотнасць, адсутнічае мабілізацыя рабочых на ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, на баявую падрыхтоўку трактарнага парка да веснавой сяўбы 1938 года.

У майстэрнях на рамонце толькі фармальна створаны рамонтныя брыгады. Соцыялістычныя дагаворы паміж імі рэдка дзе заключаны. У выніку па-сапраўднаму не разгортваецца стахانаўскі рух. Адсюль нізкія тэмпы і нізкая якасць у рабоце.

Работнікі машынна-тэхнічных аддзелаў зональных упраўленняў Наркамзема БССР бездапаможна разводзяць рукамі, ніякіх мер не прымаюць па арганізацыі хутчэйшага і высокаякаснага рамонту трактароў, па забеспячэнню запаснымі часткамі.

Час не чакае. Далейшая маруднасць у рамонце трактароў ставіць пад пагрозу своечасовы выхад ідаровага трактарнага парка на соцыялістычныя палі.

Неабходна зараз-жа ламаць усякія перашкоды, якія свядома сям-там стварэюць варожыя элементы, і забяспечыць падрыхтоўку трактарнага парка да веснавой сяўбы.

Н. ВІШНЕЎСКІ.
А. ЛОСЬ.

СТАХАНАЎЦЫ НА РАМОНЦЕ ТРАКТАРАЎ

Сярод рабочых Полацкай МТС разгортваецца стахانаўскі рух. Выдатныя ўзоры прадукцыйнасці працы паказвае малады токар Каралёў Аляксей па абточны балоў для шпор. Штодзённа ён выконвае норму на 300 проц. 17 снежня ён выканаў норму на 400 проц.

Не адстае ад Каралёва і токар тав. Малашонак, які таксама дае высокую прадукцыйнасць працы, у тры разы перавыконваючы норму.

Тт. Каралёў і Малашонак абавязаліся да новага года яшчэ больш павысіць прадукцыйнасць сваёй працы.

ЖЫХАРАЎ.

НЕ РАЗМЯРКОЎВАЮЦЬ ДАХОДЫ

Кіраўніцтва калгаса «Герой працы», Дубровіцкага сельсовета, Клімавіцкага раёна, па-шкодніцку адносіцца да засыпкі насенных і страхавых фондаў і размеркавання даходаў сярод калгаснікаў.

У калгасе да гэтага часу не закончылі абмалот збожжавых культур. Збожжа знаходзіцца ў дрэнных гумнах, гніе і раскрадаецца.

Чаму маўчыць клімавіцкі райвыканком?

ЕРАШКОЎ Іван.

Рэалізуючы баявыя ўказанні сталінскага наркома цяжкай прамысловасці тав. Л. М. Кагановіча, стахانаўцы-меднікі Урала дабіваюцца новых поспехаў у барацьбе за высокую прадукцыйнасць працы. НА ЗДЫМКУ: лепшы забойшчык-стахانавец, брыгадзір Краснагвардзейскага рудніка (Краснаўральск) тав. Ізмаіл Юносаў у забоі. Тав. Юносаў быў удзельнікам усесаюзнай нарады работнікаў меднай прамысловасці, ён сістэматычна выконвае норму выпрацоўкі руды на 200—220 проц.

Фото Н. Крылова (СФ).

АБ КАЛГАСНЫМ УЛІКУ

Адказная задача пастаўлена перад рахункаводамі і рэвізійнымі камісіямі калгасаў, перад кожным інструктарам-бухгалтарам калгаснага ўліку зямельных органаў.

Але ў Шклоўскім раёне гэтага не хочуць разумець. Заблытаны ўлік і раскраданне калгасных сродкаў, да гэтага часу маюць месца ў цэлым радзе калгасаў раёна. Старшыні калгасаў ва многіх выпадках распараджаюцца калгаснымі сродкамі як ім толькі ўздумецца, без рашэння агульнага схода. Прыхода-расходныя кашторысы, зацверджаныя агульнымі сходамі, парушаюцца, а вінаватыя астаюцца беспакаранымі. Многія калгаснікі — рахункаводы, загадчыкі фермамі і кавалі, наперакор статуту сельгасарцелі апрача працадзён атрымліваюць зарплату і грашыма.

Праўленні не аддаюць належнай увагі ўліку і справаздачнасці ў калгасах. Яны дапускаюць выдаткаванне грашовых сродкаў калгаса на непатрэбныя рэчы, не клапоцяцца своечасова спагнаць запазычанасць ад розных асоб і арганізацый. Празмерныя адміністратыўна-ўпраўленчыя расходы падрываюць гаспадарчую магутнасць калгасаў і зніжаюць каштоўнасць працадня калгаснікаў.

Дрэнны ўлік і кантроль за даходамі палягчае ворагам народа і розным прахадзімцам раскрадаць грамадскую ўласнасць. У некаторых калгасах рэвізійных камісій зусім няма, а там, дзе яны ёсць, члены іх у большасці зыпадкаў малапісьменныя або зусім непісьменныя. Рэвізійныя камісіі калгасаў райвыканкомам ніколі не затверджаліся.

Інструктароў-бухгалтароў па калгасному ўліку ў раёне зусім мала.

У калгасе «Чырвоны Кастрычнік», Улапаўскага сельсовета, улік пастаўлен дрэнна. У працасе правядзення рэвізіі там выяўлена падробленне грашовых дакументаў і дакументаў уліку працадзён. Былы старшыня калгаса Трусаў распараджаўся грашовымі сродкамі калгаса як сам хацеў. За 8 месяцаў 1937 г. па адміністратыўна-ўпраўленчыя расходы перавыдаткавана 583 руб. Ёсць растрата ў 1.376 руб., з якіх асабіста Трусавым прысвоена 782 руб.

Характэрным з'яўляюцца факты, якія ёсць у калгасе «Перамога», Александрыйскага сельсовета. Старшыня калгаса Валетаў у 1935 годзе зрабіў вялікую растрату ў калгасе. Следчыя органы факты аб растрацэ пацвердзілі. Аднак Валетаў астаўся беспакараным. У 1936 годзе атрымлівае пуцёўку на курорт. На дарогу самавольна бярэ з касы калгаса без усякага на тое права 550 руб. Прыехаўшы з курорта, пры дапамозе прайдзісвета-рахункавода Ароназа (сына былога буйнага гандляра) і па заданню былога старшыні Александрыйскага сельсовета Чыжова рознымі спосабамі пачаў раскрадваць грашовыя сродкі калгаса, арганізоўваючы куцяжы і вечары.

Рэвізіяй гэтага калгаса зыяўлена, што за перыяд з 1 студзеня 1936 г. па 18 кастрычніка 1937 г. растрачана калгасных сродкаў 11.609 руб. 52 кап., з якіх 4.208 руб. растрачана на гарэлку і закусі.

Праўленне калгаса «Новы быт», Александрыйскага сельсовета, груба парушае сталінскі статут сельскагаспадарчай арцелі. Праца ў калгасе не нарміравана. Колькі каму брыгадзір або старшыня калгаса хочуць, столькі і налічваюць працадзён. Агульны сход калгаснікаў устанавіў нормы выпрацоўкі на малацьбу і іншыя віды работы, але старшыня калгаса Казлоў С. іх адмяніў. Штодзённа раніцай перад выхадам на работу з кожным калгаснікам у паасобку ён дагаварваецца колькі працадзён налічае яму за даручаную работу. Таму ёсць нямала выпадкаў, калі за малакваліфікаваную работу налічваюць у дзень ад 2 да 4,5 працадзён.

Аўтарытэт прапоўнай кнігі, як асноўнага разліковага дакумента калгаснікаў, тут свядома падарван. Выпрацаваныя працадні зносяцца ў кнігу несвоечасова і няпоўнасцю. Авансы, якія атрымліваюць калгаснікі, і галавы разлік у кнігі зусім не запісваюцца. Такі ўлік працы свядома накіраван на падрыў стахانаўскага руху ў калгасе, на падрыў працоўнай дысцыпліны.

Трэба заўважыць, што адсутнасць працоўнай кнігі калгаснікаў і налічэнне працадзён строга па нормах выпрацоўкі, зацверджаных агульным сходам, у большасці калгасаў Шклоўскага раёна не выконваецца. Ніхто ў гэту справу не лічыць патрэбным умешвацца.

Заканчваецца сельскагаспадарчы год. Канчаткова размяркоўваюцца багатыя даходы па працадзнях. Вага калгаснага працадня нямала залежыць ад таго, наколькі правільна ўлічаны і захаваны ад псавання, растрат і раскрадання даходы; наколькі правільна складзена гадавая справаздача і канчатковае размеркаванне даходаў. Учотна-статыстычнаму аддзелу Наркамзема БССР неабходна прыняць усе меры, каб як мага хутчэй упарадкаваць кіраўніцтва калгасным улікам, кантролем і справаздачнасцю.

А. ЛЯСНІЧЫ.

ВЫКАРЧАВАЦЬ ДА КАНЦА ВАРОЖАЕ АХВОСЦЕ

ЛЁЗНА. (Спец. кар. «Звязды»). У Лёзнянскім раёне доўгі час на адказнай партыйнай і совецкай рабоце арудавалі заклятыя ворагі народа, польскія шпіёны і дыверсанты. Уся іх контрэволюцыйная падрыўная дзейнасць была накіравана на зрыў мерапрыемстваў партыі і ўрада па палітычнаму і арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў па палепшанню добрабыту калгаснікаў.

Аднак, раённы камітэт партыі не зрабіў для сябе з гэтага належнага вываду. Партыйная арганізацыя і прапоўныя не мабілізаваны на выкарчоўванне варожага ахвосця, якое і па гэты дзень прапітвае сваю шкодніцкую работу ў раёне на радзе ўчасткаў.

Адным з такіх участкаў з'яўляецца племгас «Крынкі». За вусім кароткі перыяд часу шкоднікі знішчылі тут шмат буйнай рагатай жывёлы, коней і свіней.

У мэтах знішчэння жывёлы, шкоднікі кормяць яе мёрзлай бульбай. 7 тысяч пудоў бульбы папярэдне было прыведзена ў негодную. 70 тон канцэнтраваных кормаў раскрадзена кладаўшчыком Мялешка (былы кулак, брат асуджан за контрэволюцыйную дзейнасць).

Дырэктарам племгаса (ён-жа старшыня рабачкома і парторг) працуе, «комуніст» Трэйбуш — стаўленік польскага шпіёна, які арудаваў у раёне на адказнай пасадзе. Раней Трэйбуш працаваў у гэтым-жа племгасе ў якасці ветэрынарнага ўрача і разам з былым дырэктарам заваз выкрытым ворагам, праводзіў шкодніцкую работу. І не выпадкова ў часе выбарчай кампаніі ў племгасе мелі месца факты контрэволюцыйных вылазак, накіраваных на зрыў выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

У раёне працягваецца падрыўная дзейнасць, накіраваная на знішчэнне конскага пагалоўя. На працягу года знішчана шмат коней і абартавала 30 конематак. Вялікая колькасць коней прывезена ў захудалае становішча. У калгасе «Камінтэрн» з маючыхся 24 коней большая палова ў рэзультаце варварскіх адносін канчаткова дабіта. У такім-жа стане конскае пагалоўе і ў калгасах Чэрніцкага, Каспінеўскага, Кальшанскага сельсоветаў. У цэлым радзе калгасаў («На рубяжы» і інш.) коні стаяць у дрэнна абсталяваных канюшнях.

Не інакш як шкодніцкім актам можна распаніць дзеянні, накіраваныя на зрыў пастановы партыі і ўрада аб дапамозе беларускаму калгаснаму сялянству. Такое важнейшае мерапрыемства, як перадача калгасам лесу, у раёне праведзена кабінетным паралкам. У рэзультаце, замест лесу рад калгасаў («Авангард», імя Кірава, «Будаўнік», «Пяцігодка» і іншыя) атрымалі толькі хмызняк і балоты.

Выбарчая кампанія ўзняла новую хвалю энтузіязма і палітычнай актыўнасці сярод прапоўных раёна. Аднак раённыя арганізацыі не скарысталі гэты ўзлёт і не мабілізавалі калгаснікаў і алнаасобнікаў на своечасовае выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай. Усе віды загатовак зрываюцца. На сёнешні дзень яшчэ не выканан план ільназагатовак, у той час, як вялікая колькасць палнятай ільнатрасты (каля 250 га) знаходзіцца на полі пад адкрытым небам прыходзіць у негоднасць. Шмат трасты ляжыць яшчэ пад снегам не палнятай.

Выключна дрэнна ідзе ў раёне падрыхтоўка да веснавой сяўбы. План засыпкі насення па калгасах выканан толькі на 50 проц. У 33 калгасах раёна («Профінтэрн», імя Калініна імя Кірава, «Чырвоны прамень», «Пражэктар» і інш.) зусім не засыпана насення яравых культур (аўсу, ячменю, пшаніцы). Ёсць факты псавання насення.

Ні адна МТС (а іх у раёне тры) яшчэ не ўзялася як след за рамонт трактароў сельскагаспадарчых машын і інвентару. Крынкаўская МТС з 26 трактароў адрамантавала толькі 4, Лёзнянская МТС з 14 трактароў адрамантавала 7, Дабрамысленская МТС з 12 трактароў адрамантавала 6.

Чаму Лёзнянскі раён знаходзіцца ў такім глыбокім прарыве? Дзе корань зла? Адказу на гэтыя пытанні доўга шукаць не прыходзіцца. Справа ў тым, што ў кіраўніцтве раёна знаходзяцца стаўленікі польскага шпіёна, які доўгі час тут арудваў на адказнай пасадзе. Нямала шкодніцкіх спраў правялася рукамі гэтых стаўленікаў. Старшынёй РВК працуе Шапураў. У свой час ён працаваў старшынёй Глоданскага сельсовета, дзе ўтвараў яўныя беззаконні. Аднак, не гледзячы на гэта, Шапураў вылучаецца інструктарам райкома партыі, а праз некаторы час — старшынёй райвыканкома.

Выкарыстоўваючы каварныя метады свайго кіраўніка па варожых справах, Шапураў акружае сябе ў райвыканкоме ўсялякімі сумніцельнымі людзьмі. У РВК знайшоў было сабе прытулак нядаўна выкрыты ворат народа, нацыяналіст. Загадчыкам райземаддзела працуе Дзямідаў, які ў свой час працаваў старшынёй Унаўскага сельсовета і лічыўся ў польскага шпіёна на добрым рахунку, неаднаразова ім прэміраваўся, пасылаўся на курорты.

І гэта ў той час, калі Дзямідаў утвараў злачынкі над калгаснікамі і алнаасобнікамі. У алнаасобнікаў вёсак Рауты і Альшуціна ён забіраў апошніх кароў і свіней. За гэтыя варожыя справы подлы вораг народа, польскі шпіён вылучыў Дзямідава на пасаду загадчыка райземаддзела, дзе ён працягвае сваю варожую работу.

Стаўленікі шпіёна арудуюць і ў райкоме партыі. Інструктарам райкома працуе Хацімчанка. У свой час ён быў старшынёй райпрофсовета і там разам з жулікам Жураўлёвым растраціў тысячы рублёў дзяржаўных грошай. Абслугоўваючы Глоданскі сельсавет і ніведаючы часта Горбаўскі сельсавет, Хацімчанка ўсяляк заахвочваў очкаўпірацельскія справы і беззаконні, якія там праводзіліся. На адным з прэзідыумаў Глоданскага сельсовета Хацімчанка прапанаваў аштрафаваць усіх старшынь калгасаў на 100 рублёў.

Да гэтага «букета» можна далучыць і дырэктара Лёзнянскай МТС Лобіка, брат якога асуджан за контрэволюцыйную дзейнасць. Уся яго работа выклікае недавер'е калгаснікаў. І недарам кандыдатура Лобіка была адвезена пры вылучэнні яго старшынёй участковай выбарчай камісіі.

Старшынёй калгаса «Віцебскі пролетарый» працуе член партыі Кавалеўскі Іван. Аб яго дружбе з польскім шпіёнам ведаюць многія. Перад ад'ездам з раёна вораг народа пакінуў на памяць Кавалеўскаму сваю фотакартку.

Што-ж робіць райком і яго сакратар, каб ачысціць кіруючы апарат ад класава-варожых элементаў і ліквідаваць у раёне вынікі шкодніцтва? Цяперашні склад бюро райкома не забяспечвае большэвіцкага кіраўніцтва раёнам. Амаль усе члены бюро—Шапураў, Лобік, Дзямідаў — стаўленікі польскага шпіёна. Сам сакратар райкома Бугроў таксама выклікае ў партарганізацыі палітычнае недавер'е. Ён доўгі час працаваў у Гомелі і быў цёсна звязан з арудваўшымі там ворагамі народа. Быў ён звязан і з ворагамі, якія арудвалі ў ЦК КП(б)Б.

Аб «рабоце» Бугрова, як сакратара райкома, можа сведчыць факт правалу партыйна-масавай работы ў раёне. Ужо некалькі месяцаў, як не праводзяцца ў пярэдніх партыйных арганізацыях сходы. Партвучоба згорнута. Паліттурткі ў калгасах развалены. Ніякая работа не праводзіцца па прыёму ў партыю лепшых, адданых людзей.

Трэба спадзявацца, што Лёзнянская партыйная арганізацыя на аснове разгорнутай большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі дасць большэвіцкую ацэнку становішча спраў у раёне і прыме рашучыя меры да ачысткі сваіх радоў, кіруючага апарата ўстаноў і калгасаў ад варожага ахвосця.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.
А. ГУСІНА.

Міжнародны агляд

Ваенныя дзеянні ў Кітаі, не гледзячы на бурнае наступленне японскіх войск, развіваюцца зусім не так, як хацелася-б японскаму камандаванню. Не гледзячы на ўзяцце Шанхая і Нанкіна, японскім захватчыкам не ўдалося дабіцца асноўнай мэты: паставіць на калені кітайскі ўрад, прымусіць яго прыняць японскія ўмовы «міру», г. зн. японскія ўмовы поўнага заняволення Кітая. Супраціўленне кітайскага народа расце і шырыцца; магутны антыяпонскі рух ахапіў усю краіну.

Японцы разлічвалі, што захват Паўночнага Кітая ім удасца ажыццявіць пры дапамозе чатырох дывізій на працягу максімальна двух месяцаў. На шанхайскую авантуру былі «асігнаваны» дзве дывізіі. А што атрымалася на практыцы? Даўно прайшлі два месяцы, і японцам прышлося перакінуць на азіяцкі мацярык не менш мільёна салдат.

Усе разлікі японскага камандавання паляцелі кувыркам.

Кітай не думае здавацца. Наадварот, ён нязменна ўзмацняе супраціўленне. Кітайскае камандаванне вельмі добра ўлічвае значную перавагу японцаў у ваеннай тэхніцы і авіяцыі і ў адпаведнасці з гэтым будуе сваю абарончую барацьбу супроць японскіх захватчыкаў. Кітайскія войскі аказваюць сур'ёзнейшае супраціўленне японцам, — аб сіле гэтага супраціўлення можна меркаваць па стратах японскіх войск, якія толькі за апошнія дні і толькі пад Нанкінам страцілі звыш 6.000 чалавек. Кітайская армія адступае, адступае згодна плана, але яна не разбіта, па сутнасці справы не напярэпела ні аднаго сур'ёзнага паражэння і сумела захаваць у цэласці ўсе асноўныя ваенныя сілы.

У раёнах захопленых японцамі, усё грозней і напорыстей хваля партызанскага руху. Партызаны дзейнічаюць у раёне Бэйпіна і Тяньцзіня, яны дзейнічаюць уздоўж усёй Бэйпін-Ханькоускай чыгункі, уздоўж Калган-Тайюаньскай чыгункі, у раёне Тяньцзінь-Пукоускай чыгункі. Лік партызан, дзейнічаючых толькі ў Паўночным Кітаі, перавышае сто тысяч чалавек. Трэба мець на ўвазе, што за апошні час у сувязі з японскай агрэсіяй ва ўласна Кітаі вельмі рэзка ўзмоцніўся партызанскі рух ў Манчжурыі. Агульная колькасць партызанскіх атрадаў, дзейнічаючых у Манчжурыі, вызначаецца ў 80 тысяч чалавек.

Ці дзіўна, што японцам да гэтага часу не ўдалося нават наладзіць апарат упраўлення ў захопленых імі раёнах. Труднасці японцаў растуць і будуць расці. «Разумныя галовы ў Токіо, — піша лонданскі «Эканаміст», — не могуць глядзець без трывогі на бясконцы ланцуг затрудненняў, так імкліва насоўваючыхся на Японію».

Вось гэты «бясконцы ланцут затрудненняў» і з'яўляецца адной з асноўных прычын ліхаманкавай актыўнасці японскіх агрэсараў. Як апалеўцы звер, якому не даецца ў рукі афяра, лютуюць японскія захватчыкі, не лічачыся не толькі з Кітаем, але і з іншымі імперыялістычнымі дзяржавамі, маючымі інтарэсы ў Кітаі.

Мала таго, што японцы гаспадараць у міжнародным сетльменце Шанхая, яны палявяргаюць абстрэлу амерыканскія і англійскія судны, знішчаючы яшчэ да прабачэнняў, але не да змены сваёй тактыкі.

Дзеянні японскіх імперыялістаў у Кітаі паказваюць з усёй наглядзнасцю, што японскі імперыялізм дабіваецца поўнага заняволення Кітая і ўстанаўлення свайго непадзельнага панавання над гэтай краінай.

Наўрад ці трэба даказваць, што палітыка Японіі ўдарае па самых жыццёвых інтарэсах Англіі і ЗША. Аднак пазіцыі гэтых дзяржаў, у першую чаргу Англіі, менш за ўсё гаворяць аб тым, што яны прымуць якія-небудзь сур'ёзныя меры супроць японскай агрэсіі. У Злучаных Штатах яшчэ дастаткова моцны, відаць уплыў так званых ізаляцыяністаў, уяўляючых, што ад любой агрэсіі можна схавацца за шыльдай «нейтралітэта». У Англіі-ж да гэтага часу яўна не пакінулі надзеі на тое, што ўдасца згаварыцца з японскімі захватчыкамі за кошт Кітая. Каралей гаворачы, буржуазна-дэмакратычныя дзяржавы прадаўжаюць у Кітаі прытрымлівацца той-жа палітыкі «неўмяшання», якая заслужыла такую сумную славу ў Іспаніі.

***

Палітыка «неўмяшання», правільней—палітыка патурання агрэсіі, натуральна, толькі заахвочвае падпальшчыкаў вайны, усё ўзмацняючых сваю падрыўную работу, накіраваную да зрыву міру, да развязвання новай сусветнай вайны. Як актыўна працуюць агрэсары ў галіне дыпламатычнай, мог на практыцы пераканацца французскі міністр замежных спраў Дэльбос у часе паездкі па Еўропе.

Місія французскага міністра заключалася ў тым, каб замацаваць сувязі з тымі дзяржавамі Цэнтральнай і Паўднёва-Ўсходняй Еўропы, з якімі Францыя знаходзіцца ў саюзных адносінах і якія ўваходзяць у так называемую французскую сістэму безапаснасці. Дэльбос наведаў Варшаву, Бухарэст, Белград і Прагу.

Якія-ж вынікі паездкі Дэльбоса, яго перагавораў у Варшаве, Бухарэсце, Белградзе? Варта напомніць, што яшчэ ў 1935 годзе і Польшча, і Румынія, і Югаславія прымалі ўдзел у санкцыях супроць Італіі на аснове рашэнняў Лігі нацый. Наўрад ці знойдзецца цяпер такі наіўны чалавек, які паверыць, што гэтыя тры дзяржавы занялі-б зараз такую-ж пазіцыю, як у 1935 годзе. Дастаткова характэрна ўжо тая акалічнасць, што ў афіцыяльных паведамленнях аб рэзультатах перагавораў Дэльбоса ў Варшаве і Белградзе нават не ўпамінаецца Ліга нацый, як не ўпамінаецца і калектыўная безапаснасць.

У Варшаве французскі міністр замежных спраў, як канстатуе сам французскі друк, папярэдуе яўную няўдачу. Палкоўнік Бек гэты прызнаны коміваяжэр германскага фашызма, зусім ясна даў зразумець, што Польшча не мае намеру алмаўляцца ад германскай арыентацыі. Больш таго, Бек выступіў у якасці адваката германскага фашызма, падтрымаўшы каланіяльныя патрабаванні Германіі. Верны сваёй камісіянерскай прыродзе, Бек прапанаваў Дэльбосу свае паслугі для наладжання апошняму запрашэння ў Берлін. Прапановы Дэльбоса, накіраваныя ў бок паляпшэння польска-чэхаславацкіх адносін, былі катэгарычна адхілены. Ініцыятыва ва франка-польскіх перагаворах яўна выпала з рук французскага міністра. Адсутнасць упамінання Лігі нацый у афіцыяльным паведамленні аб зыходзе перагавораў сведчыць хутчэй аб уступчывасці Дэльбоса, але зусім не Бека.

У Бухарэсце Дэльбосу павязло некалькі больш. Прыём быў больш цёплым. Але і ў гэтым выпадку замежны друк выказвае сумненні ў тым, ці ўдалося французскаму міністру замежных спраў схіліць румынскага караля Кароля адмовіцца ад германафільскай палітыкі.

І ў Югаславіі французскі міністр не дабіўся асаблівага поспеху. Югаслаўскі прэм'ер Стаядынавіч, які да прыезду Дэльбоса паспеў пабываць у Рыме (а зараз збіраецца ў Берлін), заявіў, што лічыць збліжэнне Югаславіі з Італіяй станоўчым фактам і будзе далей працаваць у гэтым напрамку. Стаядыновіч, праўда, абяцаў заняць асцярожную пазіцыю ў пытанні аб прызнанні Франко і не далучацца да блока трох агрэсараў. Але ўжо самая пастаноўка гэтых пытанняў знамянальна ў перагаворах паміж двума саюзнікамі, чаколькі блок трох агрэсараў рэзка завостраў супроць Францыі.

Такім чынам, французскі міністр замежных спраў меў поўную магчымасць убачыць падзенне ўплыву Францыі, паслабленне яе пазіцый у Цэнтральнай і Паўднёва-Ўсходняй Еўропе.

У чым-жа прычына гэтага? Ва ўзмацненні агрэсараў? Зусім не. Унутранае становішча і Германіі і Італіі не паляпшаецца, а рэзка пагаршаецца. Прычына ў тым, што Францыя, яўна ідучы па стапах Англіі, не арганізавала адпору агрэсарам, дапусціла стварэнне для агрэсараў атмасферы беспакаранасці і тым самым пагаршала ў малых дзяржавах веру ў калектыўную безапаснасць, у прынцыпы Лігі нацый. Палітыка Лазаля ў часе італьянскай авантуры ў Абісініі была першым прыкладам у гэтых адносінах, англа-французская палітыка «неўмяшання» ў Іспаніі—другі, не менш яркі прыклад таго-ж роду.

***

6 лістапада фашысцкая Італія прымкнула да так званай «антыкамінтэрнаўскай згоды», г. зн. да блока трох агрэсараў (Германія, Японія і Італія), а 11 снежня Вялікі фашысцкі совет прыняў рашэнне аб выхадзе Італіі з Лігі нацый. Зусім відавочна, што рашэнне Італіі прама вынікае з тых абавязацельстваў, якія накладзае на яе дагавор з Германіяй і Японіяй. Тым самым зноў і зноў пацвярджаецца ўжо вядомая ісціна, што блок агрэсараў, прыкрываючыся сцягам «барацьбы супроць большэвізма», мае сваёй асноўнай мэтай барацьбу супроць міру. Узрыў Лігі нацый тымі ці іншымі сродкамі, натуральна, уваходзіць у гэты план.

Выхад Італіі з Лігі не зрабіў колькі-небудзь сур'ёзнага ўражання ў Жэневе. Справа ў тым, што Італія фактычна не прымае ўдзел у работах Лігі больш года. Паміма таго, Італія ніяк не можа быць уключана ў лік дзяржаў, якія імкнуцца да захавання міру. Такім чынам, Ліга нацый не ачула асобай страты, і «гістарычны жэст» Мусаліні прагучэў халастым выстралам.

Рашэнне Вялікага фашысцкага созета—лішні доказ таго, што фашысцкая Італія страціла самастойнасць у сваёй знешняй палітыцы, што гэта палітыка, якая ўжо ў вялікай меры залежала ад Берліна з моманту ўзнікнення прэславутай «асі Рым—Берлін», цяпер у яшчэ большай ступені залежыць ад нова народжанай «асі Рым—Берлін—Токіо».

Але не ў самой Італіі справа! Зусім відавочна, што, убіраючы Італію з Лігі нацый, блок агрэсараў хацеў нанесці ўдар Лізе. Падпальшчыкі вайны вельмі добра ўлічваюць тыя патэнцыяльныя магчымасці барацьбы супроць агрэсіі, якія закладзены ў Лізе нацый.

Замежны друк ставіць у сувязь рашэнне Італіі аб выхадзе з Лігі нацый з нядаўнымі перагаворамі лорда Галіфакса з Гітлерам. Гэту думку можна развіць шырэй, бо спроба блока агрэсараў нанесці ўдар Лізе нацый стаіць у прамой сувязі з той палітыкай пошукаў згоды з агрэсарамі, якая характэрна для буржуазна-дэмакратычных дзяржаў Захада, у першую чаргу Англіі.

На самой справе, практыка буйных буржуазна-дэмакратычных дзяржаў у апошнія годы звялася да таго, каб не толькі не аказваць адпору агрэсару, а наадварот, усяляк ісці яму насустрач.

Чым скончыліся англа-французскія перагаворы, на якіх абмяркоўваліся наглыя патрабаванні германскага фашызма? Былі прыняты якія-небудзь меры для абуздання агрэсара? Зусім не! Англа-французскія перагаворы выявілі тэндэнцыю да адыходу ад прынцыпаў калектыўнай безапаснасці і да пошукаў згоды з агрэсарамі. Ці варта пасля гэтага здзіўляцца ўзросшай нагласці агрэсараў?

Націск агрэсараў узрастае не толькі ў сувязі з палітыкай патурання, але ў сувязі з тымі ўнутранымі труднасцямі, якія перажываюць усе ўдзельнікі агрэсіўнага блока. Гэтыя труднасці агульнавядомы: Італія давезена да разарэння, у Германіі народ галадае, запазычанасць Японіі перавысіла нацыянальны даход краіны. Глеба пад нагамі агрэсараў гарыць. Яны зусім не так моцны, як прабуюць гэта паказаць. І таму ёсць поўная магчымасць абузаць іх.

Тым больш недаравальна палітыка патурання, якую з такой упартасцю, заслугоўваючай лепшага ўжывання, праводзяць у адносінах да падпальшчыкаў вайны буржуазна-дэмакратычныя дзяржавы.

Я. ВІКТАРАЎ.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (арагонскі) ФРОНТ

Міністр абароны рэспубліканскага ўрада Прыэто ўвечары 21 снежня перад паседжаннем совета міністраў афіцыйна паведаміў журналістаў пра ўзяцце Тэруэля рэспубліканскімі войскамі.

Згодна паведамленню іспанскага міністэрства абароны, увечары 20 снежня рэспубліканскія войскі занялі Вілья Эспеса, дзе знаходзілася некалькі гнёзд мяцежнікаў, якія аказвалі супраціўленне і затрудняілі сувязь з рэспубліканскімі войскамі, дзейнічаючымі к поўдню ад Тэруэля. У Вілья Эспесе рэспубліканскія войскі захапілі 5 кулямётаў, каля 150 вінтовак і вялікую колькасць ваеннага снаражэння. Рэспубліканскія войскі прадаўжалі ў той-жа час стрымліваць на знешняй лініі акружэння часці мяцежнікаў, якія імкнуліся аказаць дапамогу гарнізону мяцежнікаў Тэруэля. Раніцай 21 снежня рэспубліканскія войскі ўзмацнілі націск на Тэруэль. Ведучы атаку з поўначы і з паўночнага захаду, рэспубліканцы занялі некалькі будынкаў, прасунуліся да чыгуначнага моста і поўнасцю занялі могілкі. Атака рэспубліканскіх войск узлоўж дарогі з Вільястар, к захаду ад ракі Турыя, прадаўжалася з ранейшай сілай. К усходу ад гэтай ракі рэспубліканскія войскі пачалі пранікаць у прадмесце Тэруэля.

Па паведамленню Гавас, на працягу шостага дня наступлення рэспубліканскіх войск на Тэруэль кальцо вакол горада сціснулася яшчэ шчыльней. Заняцце рэспубліканцамі некалькіх стратэгічных пазіцый дазволіла ажыццявіць сувязь з часцямі, вядучымі асаду горада. Выкарыстоўванне лёгкіх танкаў дало рэспубліканцам магчымасць знішчыць гнёзды мяцежнікаў, якія аказвалі супраціўленне. Бамбардыроўка горада мела разультатам разбурэнне значнага ліку ваенных аб'ектаў. Бамбардыроўкай была закранута радыёстанцыя, якая перастала адказваць на пазывы Сарагосы і Лагроньо. Тэлеграфныя і тэлефонныя зносіны з горадам былі перарваны і Тэруэль ізаляван ад астатняй тэрыторыі, захопленай мяцежнікамі.

Шосты дзень наступлення на Тэруэль азнаменаваўся контратакамі мяцежнікаў, зробленымі ў трох пунктах заходняга сектара. Адну контратаку прадпрыняла група зойск мяцежнікаў, якая імкнулася зайсці ў тыл рэспубліканскім войскам. Другая контратака была прадпрынята мяцежнікамі ўзлоўж дарогі Сарагоса—Тэруэль і прылягаючых да яе вёсак Кампільо і Сан Блас, якія нядаўна заняты рэспубліканскімі войскамі. Перад кожнай контратакай мяцежнікаў адбывалася ўзмоцненая артылерыйская падрыхтоўка. Мяцежнікі імкнуліся перарваць кальцо вакол Тэруэля, каб аказаць дапамогу гарнізону мяцежнікаў, які знаходзіўся ў горадзе. З'яўленне рэспубліканскай кавалерыі ў раёне вёсак Кампільо і Сан Блас, дзе баі адрозніваліся асабліва лютым характарам, унесла разгубленасць і паніку ў рады мяцежнікаў. Рэспубліканская артылерыя і авіяцыя, якія прымалі актыўны ўдзел у аперацыях рэспубліканскіх войск, перашкаджалі перагрупоўцы войск мяцежнікаў. Страты мяцежнікаў к канцу дня 20 снежня дасягнулі 40 проц. усіх уведзеных імі ў дзеянне часцей. Лініі рэспубліканскіх войск асталіся без змен. Кальцо, якое акружала Тэруэль, не гледзячы на адчайную спробу мяцежнікаў, не было перарвана, і горад быў узяты рэспубліканскімі войскамі ўвечары 21 снежня.

У раёне Кастэльяр рэспубліканцы захапілі 200 палонных і 10 гармат. У гэтым раёне рэспубліканцамі занята 100 квадратных кілометраў тэрыторыі. У раёне Кастральво рэспубліканцы ўзялі ў палон 100 чалавек.



ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ. НА ЗДЫМКУ — артыперысты 8-й нацыянальна-рэвалюцыйнай кітайскай арміі на фронце, у правінцыі Шаньсі.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

ХАНЬКОУ, 21 снежня. (БЕЛТА). Учора пачаліся моцныя баі ў ваколіцах Шаобо на поўнач ад Янчжоу (у правінцыі Цзянсу). Пасля поўнага разбурэння японскай паветранай бамбардыроўкай абаронных умацаванняў кітайскія войскі адступілі да Чучжоу. Новыя пазіцыі праходзяць паміж Чжанбалін і Фын-Ян.

Японцы зноў бамбардыравалі Сяошань і Шаосін (станцыі на чыгунцы Ханчжоу—Нінбо). Разбурана палатно чыгункі.

У ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

ХАНЬКОУ, 21 снежня. (БЕЛТА). Учора кітайскія войскі адвазвалі Цынфын, на поўнач ад Пуяна (у паўднёвай частцы правінцыі Хэбэй). Японскія войскі эвакуяваліся з Гуаньсяня (на паўночны ўсход ад Даміна). Кітайскія атрады ў тылу японцаў развіваюць вялікую актыўнасць у раёне Цанчжоу. Цэнтрам дзейнасці кітайскіх атрадаў служыць Цзяохэ (на захад ад Тяньцзін-Пукоускай чыгункі).

У ПАЎДНЁВЫМ КІТАІ

ХАНЬКОУ, 21 снежня. (БЕЛТА). 20 снежня ў Кантоне адбылася 120-тысячная дэманстрацыя па поваду стварэння самаабароны Кантона. На нарадзе ваенных і палітычных дзеячоў вырашана ўзброіць насельніцтва правінцыі Гуандун. Корпусам самаабароны будуць камандаваць былыя камандзіры 19-й арміі Чэн Мін-шу, Цзян Гуаннай, Цай Пін-кай і генерал Сян Хань-пін (памочнік камандуючага 4-й арміяй).

КІТАЙСКІЯ ПАРТЫЗАНЫ Ў ТЫЛУ ЯПОНСКІХ ВОЙСК

ХАНЬКОУ, 21 снежня. (БЕЛТА). Толькі што атрыманы весткі аб тым, што японскі штаб у Паўночным Кітаі пачаў вялікія аперацыі па «ачыстцы» акупаванай тэрыторыі Паўночнага Кітая, асабліва правінцыі Шаньсі, ад партызан. У тылу японскіх войск, размешчаных у правінцыі Шаньсі, знаходзіцца 60 тысяч байцоў 8-й кітайскай народна-рэвалюцыйнай арміі і ўзброеных партызан. З 20 паветаў паўночна-ўсходняй часткі правінцыі Шаньсі японцы «ўладаюць» толькі чатырма паветамі. Астатнія паветы знаходзяцца ў руках партызан. Супроць кітайскіх партызан, дзейнічаючых у паўночна-ўсходняй частцы правінцыі Шаньсі, пасланa 6 японскіх палкоў з Баодзіна, Датуна і Калгана. Адзін полк пасланы супроць дывізіі Хо-луна і Сяо Кэ, якая дзейнічае ў паўночна-заходняй частцы правінцыі Шаньсі. Японскія войскі размешчаны наступным чынам: дзве дывізіі ўздоўж Датун-Тайюаньскай чыгункі, адна дывізія ў раёне Калгана, адна дывізія ў раёне Баотоу і паўтары дывізіі размешчаны ўздоўж Чжэндзін-Тайюаньскай чыгункі. Рух па Чжэндзін-Тайюаньскай чыгунцы па-ранейшаму яшчэ не адноўлен. У раёне размяшчэння гэтых войск налічваецца да 36 паветаў. Для барацьбы супроць партызан і падтрымання акупацыйнага рэжыма ў правінцыі Шаньсі японцам патрабуецца велізарная армія. Усяго японскіх войск у Паўночным Кітаі зараз налічваецца звыш 10 дывізій. У шырокіх кітайскіх колах ёсць цвёрдая ўпэўненасць, што вайна супроць партызан у правінцыі Шаньсі не будзе мець поспеху.

У ПОЛЬШЧЫ ГАЛАДАЕ ЗВЫШ 910 ТЫСЯЧ ДЗЯЦЕЙ

ВАРШАВА, 21 снежня. (БЕЛТА). ППС-аўская газета «Дзённік людовы», апісваючы жабрацкае становішча дзяцей рабочых у Польшчы, указвае, што лік школьнікаў, прыходзячых у школу галоднымі, складае ў Варшаве 36 процантаў, у Верхняй Сілезіі — 27, у Памор'і — 19, у Пазнані — 15, у Лодзінскім ваяводстве — 14, на Віленшчыне — 13, у Кракаўскім ваяводстве — 12 і ў Палессі — 11 процантаў. Адзначаўшы «вядучае» месца Варшавы па ліку галодных дзяцей, газета паведамляе, што ў сярэднім па ўсёй Польшчы па 100 рэбят 13 прыходзяць у школу галоднымі. У абсалютных лічбах, піша газета, лік галодных дзяцей у Польшчы, па афіцыйных, безумоўна пераўменшаных даных, складае 910 тысяч. На глебе жабрацтва сярод школьнай моладзі шырыцца злачыннасць і прастытуцыя.

На працягу пятнаццаці з палозай месяцаў 1935-36 года ў адной толькі Варшаве ў папраўчы дом было адпраўлена 7.596 дзяцей ва ўзросце да 17 год, у тым ліку 1.777 дзяўчынак, з якіх 100 займаліся прастытуцыяй, 71 — дробнымі пажражамі і папрашайніцтвам, палова брадзяжнічала, а трэць была беспрытульнымі.

Па даных газеты, штогод варшаўская паліцыя рэгіструе 400 новых прастытутак, сярод іх 66—69 процантаў — няпоўнагадовыя. Аднак, канстатуе ў заключэнне газета, фактычны лік прастытутак у Варшазе ў чатыры разы перавышае лік «легальных» прастытутак.

ВЫБАРЫ Ў АБСТАНОЎЦЫ ТЭРОРА І АРЫШТАЎ

БУХАРЭСТ, 21 снежня. (БЕЛТА). 20 снежня ў Румыніі праходзілі выбары ў палату дэпутатаў. Пакуль падведзены папярэднія вынікі выбараў па 40 паветах з 71.

Па папярэдніх даных, апублікаваных у румынскім друку, уралавая ліберальная партыя атрымала 41 проц. усіх паданых галасоў. Нацыянал-царанісцкая партыя — 22 проц., фашысцкая арганізацыя «жалезная гвардыя» — 14 проц., фашысцкая групіроўка гогі-кузы (нацыянал-хрысціянская партыя) — 8 проц. Узесь друк, апрача ўрадавага, рысуе жудасную карціну выбараў, праходзіўшых ва ўмовах жорсткага тэрора і поўнага ігнаравання правоў працоўных.

Па румынскіх законах партыя, атрымаўшая 40 проц. галасоў, атрымлівае 70 проц. мандатаў у палаце дэпутатаў. Румынскі друк паведамляе, што тэрор і падлогі на выбарах 20 снежня мелі самае шырокае прымяненне. Так, па даных друку, 20 снежня забіта 4 чалавекі і ранена звыш 20 чалавек. Выбаршчыкі — члены ўрадавай ліберальнай партыі — атрымалі не па адпаму, а па 3—5 выбарчых бюлетэняў. Нацыянал-цараністы ў большасці раёнаў гвалтоўна не дапускаліся да выбарчых урнаў.

Яшчэ да выбараў многія прадпрыемствы і ўстановы зышлі распаралжэнне, забараняючае рабочым і служачым прымаць удзел у выбарах. Па распаралжэнню ўрада студэнты таксама не былі дапушчаны да выбараў. У той-жа час рад раёнаў быў пазбаўлен магчымасці прымаць удзел у выбарах пад тым прадлогам, што яны былі абвешчаны пад карантынам. Напярэдадні 20 снежня былі арыштаваны вылатныя кіраўнікі профсаюзаў рабочых металістаў і чыгуначнікаў. Па сканчэнні выбараў яны былі аслабанены. Увесь друк лічыць, што пры палобных металах праявлення «выбараў» ліберады змогуць атрымаць неабходныя 40 проц. галасоў.

ПАЕЗДКА ВАЕННАГА ВЕНГЕРСКАГА МІНІСТРА РЭДЭРА Ў ІТАЛІЮ

ВЕНА, 21 снежня. (БЕЛТА). Венгерскія газеты паведамляюць аб паездцы венгерскага ваеннага міністра генерала Рэдэра ў Італію. У Італіі Рэдэр быў прынят італьянскім каралём і кронпрынцам, а таксама вёў перагаворы з Мусаліні, Чыана і вышэйшымі чынамі італьянскай арміі. Далей Рэдэр падрабязна азнаёміўся з воінскімі часцямі і ўзбраеннем італьянскай арміі, паветранага і морскага флота, а таксама агледзеў буйнейшыя ваенныя заводы Італіі. Візіт Рэдэра ў Італію расцэньваецца ў Будапешце, як падрыхтоўка на налыхозячай канферэнцыі краін «рымскіх пратаколаў» (Італія, Венгрыя, Аўстрыя).

ФАТАГРАФІІ НА ПАШПАРТАХ

Для таго, каб знішчыць злоўжыванні і выключыць магчымасць карыстання чужымі пашпартамі, усе (як старыя, так і ўноў выдаваемыя) пашпарты будуць забяспечаны фатаграфіямі іх уласнікаў.

Ва ўноў выдаваемых пашпартах фатаграфіі будуць наклейвацца на пятай старонцы ў ніжнім левым кутку, а на пашпартах, тэрмін дзеяння якіх не скончыўся, маючых адзін рускі тэкст, — на чацвертай старонцы, у графе «Особые отметки» і на пашпартах з тэкстам на рускай мове і мове саюзнай і аўтаномнай рэспублікі — на 7 старонцы, у графе «Особые отметки».

Фатаграфаванне робіцца без галаўных убораў (у анфас), правы ніжні кут фотакарткі павінен аставацца светлым.

На буйных прадпрыемствах наклейка фотакартак будзе праводзіцца спецыяльна вылучанымі для гэтай мэты работнікамі РС міліцыі.

Аб дні наклейкі фатаграфій на пашпарты грамадзяне будуць паведамляцца работнікамі РС міліцыі праз домаўпраўленні або прадпрыемствы.

АСВОЕН НОВЫ ПРАДОЛЬНА-СТРУГАЛЬНЫ СТАНОК

22 снежня менскі станкабудаўнічы завод імя Варашылава ўпершыню выпусціў нозы аднакалонны прадольна-стругальны станок тыпу «СТ-2» канструкцыі завода. Станок прызначан для апрацоўкі дэталяў да варштатаў усіх тыпаў. Хуткасць работы новага станка на 50 проц. перавышае хуткасць старых стругальных станкоў. Над мантажом і яго асваеннем працавала брыгада стаханаўцаў на чале з брыгадзірам тав. Доўнарам.

У сталінскі месячнік стаханаўскіх рэкордаў завод пачне серыйны выпуск такіх станкоў. Па плану намечана ў 1938 годзе выпусціць 20 станкоў. (БЕЛТА).

БУДАЎНІЦТВА НОВЫХ ШКОЛ

Дзетзара Совецкай Беларусі ў гэтым годзе атрымала вылатны падарунак — 53 новыя школы на 17.500 вучнёўскіх месц. У студзені заканчваецца будаўніцтва яшчэ 10 школ на 2.440 месц.

У 1938 годзе Наркамасветы БССР намеціў пабудову 55 новых школьных будынкаў на 17.820 месц, у тым ліку 26 будынкаў у гарадах і 29 у сельскіх мясцовасцях. У Менску будуць пабудаваны тры 4-павярховыя будынкі на 880 месц кожны з актавымі заламі для поўных сярэдніх школ. Для іх адведзены ўчасткі на вуліцы МОПР'а, у раёне Юбілейнай плошчы і ў раёне політэхнічнага інстытута. У Віцебску з двух новых школьных будынкаў адзін будзе будавацца для цыганскай няпоўнай сярэдняй школы на 280 месц.

Выдаткі на нозае школьнае будаўніцтва ў БССР у булучым годзе вызначаюцца ў 18 мільёнаў руб.

ЗАВЯРШЭННЕ РАДЫЁФІКАЦЫІ РАЁННЫХ ЦЭНТРАЎ БССР

Да 1 студзеня ў Добрушы ўступае ў эксплаатацыю раённы радыёвузел на 500 ват. Гэтым самым будзе завершана поўная радыёфікацыя ўсіх раённых цэнтраў рэспублікі. Свае радыёвузлы маюць не толькі раённыя цэнтры, але і паасобныя соўгасы і калгасы. Радыёвузел працуе ў соўгасе імя 10-годдзя БССР, створаным у Любаньскім раёне на калісьці непрахалізмых балотах. Радыёзузел калгаса «Совецкая Беларусь», Менскага раёна, устанавіў у дамах калгаснікаў каля 80 радыёкропак, і калгаснікі маюць цяпер магчымасць слухаць па радыё перадачы з Менска і Масквы.

Радыё ўсё больш пранікае ў самыя аддалёныя пункты БССР — у калгасы Палесся, на пагранічныя заставы, на тарфяныя заводы і лесараспрацоўкі. Па рэспубліцы ўжо налічваецца 86 тысяч радыёкропак, 3 тысячы з іх былі ўстаноўлены ў сельсоветах, чырвоных кутках, у дамах рабочых, калгаснікаў, служачых у часе зыбарчай кампаніі.

МІЖРАЁННЫ НОВАГОДНІ КІРМАШ

З 26 снежня па 1 студзеня на рынках Менска арганізуецца міжраённы новагодні кірмаш з удзелам калгасаў, калгаснікаў і аднаасобнікаў Менскага, Смалявіцкага, Лагойскага, Пухавіцкага і іншых прылягаючых раёнаў.

Гандлюючыя арганізацыі горада завозяць на кірмаш для сустрэчнага гандлю розных прамысловых і харчовых тавараў на 2 мільёны рублёў.

АПЕЛЬСІНЫ, ЛІМОНЫ І МАНДАРЫНЫ ДЛЯ МЕНСКА

За апошні час у Менск узмацніўся завоз мандарынаў. Гэтымі днямі з Одэсы чакаецца атрыманне значных партый апельсінаў і лімонаў і з Аджарыстана — мандарынаў.

На працягу бліжэйшых трох месяцаў у БССР будзе завезена 50 вагонаў апельсінаў і лімонаў і 45 вагонаў мандарынаў. З гэтай колькасці Менск атрымае 25 вагонаў апельсінаў і лімонаў і 20 вагонаў мандарынаў.

УПРЫГОЖАННІ ДЛЯ ЁЛАК

Менская канцэлярская фабрыка «Комунарка» выпускае для ўпрыгожання новагодніх ёлак 100 тысяч набораў — бамбанераў з цукеркамі, кулёчкаў у рознакаляровай празрыстай паперы і т. д. 89 тысяч такіх набораў-упрыгожанняў ужо выпушчана.

ЗДАРЭННІ

Ляснік Аксанаўскага лясніцтва (вёска «Крестьянка», Шумянскага сельсовета, Віцебскага раёна) Н. К. Іваноў, пайшоўшы на работу, пакінуў сваю паляўнічую стрэльбу дома. Яго 8-гадовы сын Нікалай, знайшоўшы на шафе патрон, зарадзіў вінтоўку і выстраліў у 6-гадовую сястру Тамару. Апошняя была дастаўлена ў больніцу, дзе праз некаторы час памёрла. Бацька — Іваноў Н. К. прыцягваецца да крымінальнай адказнасці.

Намеснік адказнага рэдактара І. М. ОФЕНГЕЙМ.

БЕЛДЗЯРЖДРАМТЭАТР
23 снежня Абан. № 76
ВОЧНАЯ СТАЎКА

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
КАРО

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
ЛЕНІН У КАСТРЫЧНІКУ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
«УЩЕЛЬЕ АЛАМАСОВ»

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
АНЕНКАЎШЧЫНА

Гукавы кінотэатр «Спартак»
ПЁТР ПЕРШЫ

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА
на 1938 год
НА ВЫСТАВАЧНУЮ МАСТАЦКУЮ
ФОТАГАЗЕТУ

ВЫДАННЕ БЕЛСАЮЗФОТО
(3-ці год выдання). Выходзіць 1 раз у месяц.

ФОТАГАЗЕТА з'яўляецца адным з сродкаў мастацкай агітацыі і прапаганды, адлюстроўваючым у наглядай, яркай форме ўсе выдатныя падзеі ў СССР і за граніцай.

ФОТАГАЗЕТА разлічана на шырокія масы працоўных і прыстасавана для выстаўкі-мантажу на заводах і фабрыках, у калгасах і соўгасах, у клубах, тэатрах, дамах культуры, чытальнях, навуковых установах, чырвоных кутках і т. д.

КОЖНЫ нумар фотагазеты змяшчае не менш 25 здымкаў на 15—20 лістах. Для афармлення і мантажу газеты к нумару дадаюцца неабходныя загалоўкі, подпісы.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
на 12 мес. — 300 руб.
на 6 мес. — 150 руб.
на 3 мес. — 75 руб.

ПАДПІСКУ ПРЫМАЮЦЬ: Менск, Совецкая, 81, Белсаюзфото, Саюздрук, КОГІЗ, а таксама ўпаўнаважаныя Белсаюзфото.

БЕЛСАЮЗФОТО.

ГЭТЫМІ ДНЯМІ! ГЭТЫМІ ДНЯМІ!
У кінотэатры „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“
новы гукавы мастацкі замежны фільм
„КАЦЯРЫНА“
У галоўнай ролі — Францэска ГААЛЬ.

РАБОЧЫЯ, СЛУЖАЧЫЯ, КАЛГАСНІКІ! СТРАХУЙЦЕ СВАЁ ЖЫЦЦЕ ПА КАЛЕКТЫЎНАМУ СТРАХАВАННЮ

Калектыўнае страхаванне жыцця накіравана на палепшанне матэрыяльна-бытавых умоў працоўных мас


ГОССТРАХ СССР
КОЛЛЕКТИВНОЕ СТРАХОВАНИЕ ЖИЗНИ
УДОСТОВЕРЕНИЕ
Выдано тов. Петрову Владимиру Яковлевичу
В том что он застрахован по коллективу завода им. Молотова
(предприятие, учреждение, колхоз и т. д.)
в (городе) (районе) Минске
на сумму пять тысяч руб.
(прописью)
10 декабря 1937 г. на случай смерти от любой причины и постоянной утраты трудоспособности (инвалидности), происшедшей от несчастного случая.
Страховое свидетельство выдано коллективу
под № 38 на срок с 10 декабря 1937 г. по 10 декабря 1938 г.
Подпись (ФЗМК или комсорг)
Выдано 10 декабря 1937 г.

ДЗЯРЖАЎНАЕ СТРАХАВАННЕ САЮЗА ССР

ПЫТАННІ:
1. ХТО МОЖА СТРАХАВАЦЦА?
2. ХТО НЕ ПРЫМАЕЦЦА НА СТРАХАВАННЕ?
3. ПРЫ ЯКІХ УМОВАХ МОЖА БЫЦЬ ЗАКЛЮЧАНА СТРАХАВАННЕ?
4. НА ЯКІЯ СУМЫ МОЖНА СТРАХАВАЦЦА?

АДКАЗЫ:
1. СТРАХАВАЦЦА МОГУЦЬ РАБОЧЫЯ, СЛУЖАЧЫЯ, КАЛГАСНІКІ І ЧЛЕНЫ АРЦЕЛЕЎ НЕЗАЛЕЖНА АД УЗРОСТУ І БЕЗ МЕДАГЛЯДУ.
2. АСОБЫ, ЯКІЯ Ў ДЗЕНЬ АФАРМЛЕННЯ СТРАХАВАННЯ НЕ ЗНАХОДЗЯЦЦА НА РАБОЦЕ І АДСУТНІЧАЮЦЬ ПА ХВАРОБЕ ЦІ ІНВАЛІДНАСЦІ, А ТАКСАМА ХАТНІЯ ГАСПАДЫНІ І ЎТРЫМАНЦЫ.
3. КАЛІ НЕ МЕНШ 50 проц. (ПАЛОВА) НАЯЎНАГА САСТАВА ПРАЦУЮЧЫХ У КАЛЕКТЫВЕ, КАЛГАСЕ, ЦЭХУ ЦІ БРЫГАДЗЕ ЖАДАЕ СТРАХАВАЦЦА.
4. НА 500 р., 1000 р., 2000 р., 3000 р., 4000 р. і 5000 руб. СТРАХАВАЯ СУМА ПАВІННА БЫЦЬ АДНОЛЬКАВАЯ ДЛЯ ЎСІХ СТРАХУЮЧЫХСЯ КАЛЕКТЫВА, ЦЭХА ЦІ БРЫГАДЫ. КАЛЕКТЫЎ МОЖА ПРЫНЯЦЬ СТРАХАВАННЕ ПА ГРУПАХ У ЗАЛЕЖНАСЦІ АД АТРЫМЛІВАЕМАЕ ЗАРПЛАТЫ.

ПЫТАННІ:
5. ЯКІ РАЗМЕР ЎЗНОСАЎ ДЛЯ ПРАЦОЎНЫХ ПА КАЛЕКТЫЎНАМУ СТРАХАВАННЮ ЖЫЦЦЯ?
6. У ЯКІЯ ТЭРМІНЫ ЎПЛАЧВАЮЦЦА СТРАХАВЫЯ ЎЗНОСЫ?
7. КАМУ ПАВІНЕН ЗАСТРАХАВАНЫ ЎПЛАЧВАЦЬ СТРАХАВЫЯ ЎЗНОСЫ?
8. ШТО АТРЫМЛІВАЕ НА РУКІ ЗАСТРАХАВАНЫ?
9. КАЛІ ПАЧЫНАЕЦЦА АДКАЗНАСЦЬ ДЗЯРЖСТРАХА ПА СТРАХАВАННЮ?
10. У ЯКІХ ВЫПАДКАХ ДЗЯРЖСТРАХ ВЫПЛАЧВАЕ СТРАХАВУЮ СУМУ?
11. КАМУ ВЫПЛАЧВАЕЦЦА СТРАХАВАЯ СУМА?
12. У ЯКІХ ВЫПАДКАХ СПЫНЯЕЦЦА СТРАХАВАННЕ?

АДКАЗЫ:
5. СТРАХАВЫЯ ЎЗНОСЫ ЎПЛАЧВАЮЦЦА 3 руб. У КВАРТАЛ З КОЖНАЙ 1000 руб. СТРАХАВОЙ СУМЫ ЗА 500 руб. — 1 р. 50 к. У КВАРТАЛ, ЗА 1000 руб. — 3 р. У КВАРТАЛ, ЗА 2000 р. — 6 р. У КВАРТАЛ, ЗА 3000 р. — 9 р. У КВАРТАЛ, і т. д.
6. ПАКВАРТАЛЬНА, ПА ПАЎГОДДЗЯХ І ЗА ГОД УПЕРАД, АЛЕ АБАВЯЗКОВА НЕ МЕНШ, ЧЫМ ЗА КВАРТАЛ.
7. ЗВОРШЧЫКАМ, ВЫБРАНЫМ НА АГУЛЬНЫХ СХОДАХ СТРАХУЮЧЫХСЯ.
8. КОЖНАМУ ЗАСТРАХАВАНАМУ ВЫДАЕЦЦА СТРАХАВОЕ ПАСВЕДЧАННЕ ДЗЯРЖСТРАХА. У ЯКІМ ЗВОРШЧЫК РОБІЦЬ АДЗНАКІ АБ ПРЫЕМЕ СТРАХАВЫХ ЎЗНОСАЎ.
9. З 24 гадзін ТАГО ДНЯ У ЯКІМ ПАСТУПІЦЬ НА РАХУНАК СТРАХАВОЙ ІНСПЕКЦЫІ ПЕРШЫ СТРАХАВЫ ЎЗНОС, НЕ МЕНШ, ЧЫМ ЗА 50 проц. НАЯЎНАГА САСТАВА ПРАЦУЮЧЫХ.
10. У ВЫПАДКУ СМЕРЦІ ЗАСТРАХАВАНАГА АД ЛЮБОЙ ПРЫЧЫНЫ І ІНВАЛІДНАСЦІ АД НЯШЧАСНАГА ВЫПАДКУ.
11. ПРЫ ІНВАЛІДНАСЦІ САМОМУ ЗАСТРАХАВАНАМУ. У ВЫПАДКУ СМЕРЦІ — ТОЙ АСОБЕ, ЯКОЙ АСТАЎЛЕНА ПІСЬМОВАЕ ЗАВЯШЧАННЕ. ПРЫ АДСУТНАСЦІ ЗАВЯШЧАННЯ — ЗАКОННЫМ НАСЛЕДНІКАМ.
12. У ВЫПАДКУ НЯЎПЛАТЫ Ў ТЭРМІН ЧАРГОВЫХ ЎЗНОСАЎ ЗАСТРАХАВАНЫМ І ПРЫ НЕАДНАЎЛЕННІ СТРАХАВАННЯ НА НОВЫ ТЭРМІН.

Камсоды прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, калгасаў і соўгасаў і фабзаўмясцкомы! Арганізуйце калектыўнае страхаванне жыцця.

УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖСТРАХА НКФ БССР.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 63 ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352; сакратарыята — 25-188, 20-830; аддзелаў: партыйнага — 21-353, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага 21-356, сельскагаспадарчага — 21-847, культуры — 23-955, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189, аддзела пісем — 20-844, 21-399, 21-855, ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-556, абмеру — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № К—3196. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. К. Л. Б.